Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 247 (5080)
ЛІСТАПАДА
3
СУБОТА
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

...ИВА
...тарая площадь 4 газетному сектору
...1934 г. Звезда—2

АСТУРЫЙСКІЯ РАБОЧЫЯ ПРАДАЎЖАЮЦЬ БАРАЦЬБУ

ПАРЫЖ, 2 лістапада. (БЕЛТА). Згодна паведамленню мадрыдскай «ЛЯНАСІОН», прадаўжаючыя барацьбу рэволюцыйныя атрады маюць 11 тысяч вінтовак і 20 тысяч рэвальвераў. Агенцтва Гавас паведамляе аб рэволюцыйных атрадах, якія прадаўжаюць трымацца ў гарах Астурыі. Становішча ў краіне напружанае.

Паводле вестак агенцтва Гавас, толькі ў Астурыі паўстанцы налічваюць 2 тыс. забітых і 8 тыс. раненых. Арышты бесчупынна здбываюцца па ўсёй краіне. Більбао пры вобыску на параходзе Луіс-Адаро ў двух матросаў знойдзены. згодна паведамлення агенцтва Гавас, комуністычныя лістоўкі. Абодва матросы арыштаваны. У Більбао застрелен адзін з кіраўнікоў рэакцыйнай групоўкі.

НЕАДКЛАДНА АРГАНІЗАВАЦЬ РАЗМЕРКАВАННЕ УРАДЖАЮ

Сапраўды выдатнымі поспехамі адзначае завяршэнне сельскагаспадарчага года калгасная Беларусь. Датэрмінова выканаў план паставак хлеба і бульбы.

Упершыню за апошнія гады Беларусь выканала дзяржаўны план сіласавання, уздыму зяблёва. На два тыдні раней чым у мінулым годзе завершана азімая сяўба. Закладзены асновы ўраджаю будучага года. Ураджай гэтага года значна павышае добрабыт калгасных мас.

Завяршэнне сельскагаспадарчага года адзначаецца масавым прыліванем працоўных аднаасобнікаў у калгасы. За адзін трэці квартал у калгасы БССР уступіла звыш 16.000 бядняцка-серадняцкіх аднаасобных гаспадарак.

Калгаснікі і аднаасобнікі на канкрэтных жывых прыкладах пераконваюцца ў перавагах калгаснага ладу. Сотнямі налічваюцца ў нас калгасы, у якіх пасля выканання абавязкаў перад дзяржавай, засыпкі насенных, фуражных і іншых фондаў калгаснікі атрымаюць на працадзень па 5 і 6 кгр. толькі аднаго хлеба, не лічачы бульбы, гародніны і грошай.

У сувязі са скалічэннем сельскагаспадарчага года перад кожным калгасам зараз паўстае агромкай важнасці гаспадарча-палітычная задача—размеркаваць калгасныя даходы па працадзнях. Ад правільнага і своечасовага правядзення размеркавання даходаў будзе залежаць далейшае палітычнае і арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, далейшы рост калектывізацыі.

Было-б вялізарнейшым значыццём думаць, што размеркаванне даходаў можа быць праведзена самацёкам. Забеспячэнне цвёрдага партыйнага кіраўніцтва ўсім ходам размеркавання даходаў—вось што патрабуецца зараз ад палітаддзелаў, райкомаў партыі, нізавых партыйных і савецкіх арганізацый. Нельга забываць, што перад размеркаваннем даходаў трэба правесці вялікую папярэднюю арганізацыйную работу.

Да размеркавання даходаў можна непасрэдна прыступіць толькі тыя калгасы, якія выканалі гадавы план хлебапаставак, натуральны МТС, вярнулі насенную і харчовую пазыкі, засыпалі насенныя, страхавыя і фуражныя фонды, вызначылі хлебныя фонды для продажу дзяржаве.

Між тым, вось гэта работа перад размеркаваннем даходаў у многіх раёнах і калгасах яшчэ не закончана. Даволі сказаць аб засыпцы насенных фондаў. Па БССР на 20 кастрычніка ў насенныя фонды засыпана ўсяго 33 проц. зернавых культур. Старадарожскі, Заслаўскі, Жыткавіцкі, Копыльскі, Чэрвеньскі, Бярэзінскі, Дзяржынскі і іншыя раёны засыпалі ад 4 да 15 проц. насення, гэта значыць фактычна не прыступалі да гэтай работы. Не лепш і з вылучэннем фуражных фондаў. У радзе раёнаў нездавальняюча праходзяць хлебазакупкі.

Выканаўцы першую запаведзь—хлебапастаўкі,—калгасы павінны памятаць, што засыпка насення з'яўляецца важнейшым этапам барацьбы за заваяванне ў 1935 годзе яшчэ больш высокага ўраджаю, з'яўляецца другой запаведдзю для кожнага калгаса і калгасніка.

Партыйныя арганізацыі адказваюць за паспяховы ход хлебазакупак і стварэнне насенных, страхавых і фуражных фондаў таксама, як і за своечасовае выкананне планаў зернапаставак. Далейшая затрымка з засыпкай насення, вылучэннем фуражных фондаў зацягвае размеркаванне даходаў у калгасах, адбіваецца на арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў, на далейшым росце калектывізацыі.

Зараз аб парадку самога размеркавання. Да гэтай справы павінны быць прыцягнуты самыя шырокія масы калгаснікаў, калгасны актыў. Перад размеркаваннем даходаў у кожным калгасе арганізуецца ўзаемаправерка спаборнічаючых брыгад, праводзіцца матэрыяльна-фінансавая праверка калгасаў і вытворчая праверка брыгад. Рэвізійныя камісіі сумесна з групамі садзейнасці калгаснікаў правяраюць кожную галіну, работу кожнай брыгады ў паасобку, правільнасць запісаў і налічэння працадзён кожнаму калгаснику.

Шлях да большэвіцкага калгаса ляжыць праз умацаванне брыгады. Размеркаванне даходаў—важны момант ва ўмацаванні брыгады. Праверка, падмацаваная фактычнай ураджайнасцю, дае найбольш дасканалую ацэнку работы брыгады. Брыгада стане толькі тады пастаяннай і моцнай, калі члены гэтай брыгады атрымаюць на працадзень у строгай адпаведнасці з тым, як яны працавалі, якія канкрэтныя паказальнікі іх работы.

Брыгадам, паспяхова правёўшым гаспадарчую кампанію, даўшым ураджай, які перавышае сярэднекалгасны, дадаткова налічваюцца працадні ў размерах да 20 проц. усёй выпрацаванай імі колькасці працадзён за лік аднаасобага зніжэння ў тых-жа размерах у брыгадах з горшымі паказальнікамі работ, якія далі ўраджай ніжэй сярэдне-калгаснага.

Трэба памятаць, што дыферэнцыявання ацэнка работы брыгад сустрэне супраціўленне класава-варожых і гультайскіх элементаў. Вельмі часта, калі справа даходзіць да ацэнкі работы брыгад, пачынаюцца размовы і патрабаванні «зніжання і павышэння» працадня не праводзіць, бо ўсе працавалі аднолькава». Такім купацкім спробам падрываць каштоўнасць калгаснага працадня трэба ў самым пачатку даць рашучы адпор.

Размеркаванне даходаў пры правільным яго правядзенні з'яўляецца магутным штуршком для поўнага знішчэння лодырніцтва ў калгасах, для максімальнага ўмацавання працоўнай дысцыпліны.

Размеркаванне калгасных даходаў павінна з'явіцца магутным вагаром далейшага росту калгаснага прыпліву. На агульныя сходы калгасаў, прысвечаныя размеркаванню даходаў, неабходна спецыяльна запрашаць аднаасобнікаў для таго, каб яны на выніках гаспадарчага года, на росце даходнасці ў калгасах наглядна пераконваліся ў перавазе калгаснага ладу. Ва ўсіх калгасах, дзе правільна будзе праведзена размеркаванне даходаў, дзе калгаснікі чэсна папрацавалі над умацаваннем калгаса і стварэннем заможнага жыцця, размеркаванне ўраджаю ператворыцца ў сапраўднае свята калгаснай працы.

„УМАЦУЕМ СОВЕТЫ—ОРГАНЫ ПРОЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ

За пагалоўны, актыўны ўдзел усіх працоўных у выбарах советаў!

Лепшых ударнікаў і ўдарніц, лепшых байцоў за соцыялізм, знатных людзей нашай краіны—выбярэм у советы!" *(З лозунгаў ЦК ВКП(б) да 17 гадавіны Окцябра)*

Зварот пленума Яромкаўскага сельсовета, Аршанскага раёна, да ўсіх сельскіх советаў БССР і Совецкага Саюза

Таварышы! Ад X усебеларускага і VI усесаюзнага з'ездаў советаў прайшло не так ужо многа—тры з паловай года, а якія перамены адбыліся за гэты час. Проста дзіву даешся.

Мы ведаем аб проста-такі здзіўляючых дасягненнях ва ўсіх кутках нашай вялікай соцыялістычнай радзімы. Пабудаваны новыя апрамадныя заводы, фабрыкі, соўгасы. З кожным днём павялічваецца колькасць калгаснікаў і колькасць калгасаў.

І ў нас, у Яромкавіцкім сельсавеце, ёсць таксама вялікія дасягненні. Вось глядзіце: перавыбарчы сход мінулы раз мы праводзілі ў цяжкім святле лямп-газовак. А цяпер у нас свеціць ужо электрычная лямпачка Ільіча. Электрыфікаваны 4 калгасы і 245 хат калгаснікаў. У мінулых выбарах нашага сельсавета прымала ўдзел 36 калгаснікаў. Толькі 36. Усе астатнія былі аднаасобнікамі. А цяпер, праз тры з паловай года, у перавыбарах прымуць удзел выключна калгаснікі. Аднаасобнікаў у нас асталося на сёнешні дзень толькі 4 і тыя ўступаюць у калгас.

Гэта, зразумела, вялікія дасягненні, але мы стараліся не толькі ўцягнуць аднаасобнікаў у калгасы. Важна-ж зрабіць калгасы большэвіцкімі і каб калгаснікі пачалі жыць заможна і культурна. Для гэтага трэба добра працаваць і добрасумленна выконваць усе абавязацельствы перад пролетарскай дзяржавай. І напярэдадні перавыбараў советаў мы з гонарам заяўляем: перад пролетарскай дзяржавай усе абавязацельствы выкананы — і па хлебу, і па ільну, і па бульбе, і па мясу, і па грашовых плацяжах.

Нашы калгаснікі цяпер пачынаюць ужо жыць нядрэнна. Вось у калгасе «Х з'езд советаў» на працадзень прыпадае 4,2 кіло зярна, 12 кіло бульбы, 1 р. 20 к. грашыма. Калгаснік гэтага калгаса тав. Мееровіч Самён атрымлівае 130 пудоў зярна, 500 пудоў бульбы і звыш 600 р. грашыма. Столькі прадуктаў ні ў яго, ні ў іншых сераднякоў, а тым больш у беднякоў раней не было. У тав. Мееровіча ёсць вялікія ліпкі хлеба, ён прадаў дзяржаве 18 пуд. зярна. Але ён не выключэнне. Калгаснік тав. Кірылаў Еўстафій прадаў дзяржаве 21 пуд зярна. Мачкейчык Якаў — 16 пуд., Д. Сапелінскі — 18 пудоў, Арцём Масцалёў — 18 пудоў і т. д.

Яны маюць шмат прадуктаў, заводзяцьу сябе дробную жывёлу — свіней, парсюкоў, качак, курай. Яны пачынаюць жыць культурна. Большасць калгаснікаў сельсавета адрамантавалі свае дамы. У калгасе «Х з'езд советаў» Дыскоўскай Ульяне пабудован новы дом. Тав. Шахцёраў Павел купіў сабе новую мэблю — мяккі дыван і нікелеваны ложак. Тав. Макейчык купіў патэфон. І яшчэ можна налічыць не адзін дзесятак калгаснікаў, лепшых ударнікаў калгаснай вытворчасці, якія набылі сабе добрую мэблю і іншыя прадметы для культурнага і ўтульнага абсталявання сваёй хаты.

Чаму мы маем такія дасягненні? Вельмі проста. Таму, што мы акуратна выконваем усе ўказанні нашай партыі і нашага ўрада, таму, што мы заўсёды слухаем і выконваем указанні любімага правадыра нашай большэвіцкай партыі тав. Сталіна. Мы маем гэтыя дасягненні і таму, што нам штодзённа практычна дапамагаюць ва ўсёй рабоце раённы камітэт партыі, палітаддзел МТС і мясцовыя комуністы.

Гэтыя дасягненні мы маем і таму, што мы прыцягнулі да актыўнага ўдзелу ў рабоце совета саміх калгаснікаў і калгасніц. У нас ёсць 9 секцый і 13 дэпутацкіх груп, у якіх працуе 350 чалавек. Актывіст [illegible] ў нас знатны чалавек. Ён карыстаецца агульнай пашанай і павагай. Вазьміце члена сельсавета тав. Антонаву Дар'ю. Яна ў сваім калгасе «Ленінскія ўсходы» працуе брыгадзіршай і яе брыгада самая лепшая. А, як член сельсавета, яна дабілася на свайму ўчастку датэрміновага выканання ўсіх абавязацельстваў перад дзяржавай. Таксама добра працуюць і актывісты тт. Гапеенка, Анеінкаў Аляксандр і дзесяткі іншых.

Вось мы праз некалькі дзён пачынаем перавыбары. Нам не сорамна выступаць перад нашымі выбаршчыкамі, мы не баімося, што нас пачнуць лаяць. У рабоце-ж сельсавета прымалі ўдзел сотні выбаршчыкаў. Гэта, вядома, не значыць, што ў нас усё добра, няма недахопаў і больш рабіць няма чаго. Наадварот, нам яшчэ шмат чаго трэба зрабіць. Уперадзе яшчэ многа работы і мы сёння цвёрда заяўляем:

1. Да перавыбараў совета закончым размеркаванне даходаў і ўраджаю ва ўсіх калгасах сельсавета.

2. Дабіцемся, што да з'езда советаў нашы калгасы будуць мець культурны выгляд: пабудуем прыбіральні, пракладзем тратуары, ачысцім калгасныя двары ад гразі і смецця, пабелім дамы калгаснікаў, дабіцемся чыстаты ў кожным калгасным доме.

3. Шырока разгорнем агратэхнічную вучобу ў калгасе. Адкрыем у 4-х калгасах хаты-лабараторыі.

4. Зараз-жа пачынаем падрыхтоўку да веснавой сяўбы будучага года. Зяблёва ў нас паднята поўнасцю. Насенныя і страхавыя фонды засыпаны. Цягавая сіла ў здавальняючым стане.

А каб усё гэта зрабіць, нам трэба прыцягнуць да работы яшчэ новыя сотні актывістаў, каб кожны калгаснік прымаў самы актыўны ўдзел у рабоце сельсавета, у кіраўніцтве дзяржавай.

Але гэта не толькі наша задача, гэта задача ўсіх советаў нашай вялікай соцыялістычнай краіны. І мы выклікаем усе сельскія советы на спаборніцтва: хто лепш паставіць масавую і культурную работу, хто забяспечыць уцягненне ўсіх працоўных аднаасобнікаў у калгасы, хто лепш выканае ўказанні правадыра партыі тав. Сталіна аб развіцці жывёлагадоўлі, хто лепш правядзе справаздачна-перавыбарчую кампанію, правядзе не так, каб усе выбаршчыкі, і асабліва жанчыны, поўнасцю з'явіліся на сходы і прымалі актыўны ўдзел у перавыбарах.

Пераможцы ў гэтым спаборніцтве атрымаюць ганаровую назву лепшых сельсоветаў нашага вялікага Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Пад кіраўніцтвам ВКП(б) і яе правадыра тав. Сталіна будзем умацоўваць дыктатуру пролетарыята.

Мяжуеў, Сідарэнка, Міхееў, Савіцкі, Дземідаў, Антонава, Раманаў, Фралоў, Сільчэнка, Круцін, Боцюкаў, Ключэўскі, Прынц, Мяжуеў Ізачэнка, Чымерычка, Савіцкі, Барздоў, Галаўнёў і т. д., усяго 32 подпісы.

КІРАЎНІКАМ, ВЫКЛАДЧЫКАМ І СЛУХАЧАМ ВАЕННА-ПАЛІТЫЧНАЙ АКАДЭМІІ імя ТАЛМАЧОВА

Совет Народных Камісараў Саюза ССР горача вітае кіраўнікоў, выкладчыкаў і слухачоў слаўнай Акадэміі імя Талмачова ў дзень 15-й гадавіны.

Паздраўляючы вас з высокай узнагародай — орденам Леніна, Совнарком Саюза выказвае цвёрдую ўпэўненасць у тым, што акадэмія, даўшая тысячы палітработнікаў і камандзіраў Чырвонай арміі з моцнай большэвіцкай загартоўкай, і ў далейшым з гонарам будзе выконваць сваю задачу ў справе ўмацавання абароны нашай краіны.

Совет Народных Камісараў Саюза ССР.

НАЧАЛЬНІКУ ВАЕННА-ПАЛІТЫЧНАЙ АКАДЭМІІ імя ТАЛМАЧОВА тав. ІШПО

К майму вялікаму жалю, не магу скарыстацца вашым запрашэннем і разам з усёй акадэміяй адсвяткаваць не слаўнае 15-годдзе. Прыходзіцца пісьмова горача вітаць слухачоў, выкладчыкаў і начальніцкі склад акадэміі ў дзень яе знаменальнага юбілея і павіншаваць з высокай узнагародай яе ордэнам Леніна.

Вітаю таксама ўсіх тых большэвікоў, якім пашчасціцца атрымаць вышэйшую марксісцка-ленінскую адукацыю ў сценах нашай «Талмачоўкі» і якія зараз пастомна працуюць над умацаваннем баявой і палітычнай магутнасці рабоча-селянскай Чырвонай арміі.

З імем талмачоўца не толькі ў армії, але і ў краіне звязана ўяўленне пра моцнага большэвіка, граматнага камандзіра, выдатнага выхавальца непарўнанай нашай моладзі ў бесканечнай адданасці справе Леніна—Сталіна.

Жадаю акадэміі яшчэ большых поспехаў у падрыхтоўцы новых кадраў высокаадукаваных палітработнікаў.

Няхай жывуць талмачоўцы!

31 кастрычніка 1934 г. К. ВАРАШЫЛАЎ.

БЕЛАРУСЬ ПЕРАВЫКАНАЛА НАВІГАЦЫЙНЫ ПЛАН СПЛАВА 1934 г.

СОЎНАРКОМ—тав. МОЛАТАВУ, НАРКАМЛЕС—тав. ЛОБАВУ

Навігацыйны план сплаву 1934 года ў 3.755 тыс. кубаметраў на 25 кастрычніка перавыкананы. Прыбыпе канцовых пунктаў 3.801 тыс. кубаметраў. Прадаўжаем сплаўляць звыш плана.

Нам, старшыні Соўнаркома БССР СААК'ЯН.
Упаўнаркомлеса — РОЗІН.

Перавыбары сельскіх советаў

ВЫБРАНЫ НОВЫЯ ДЭПУТАТЫ

ЧЭРЫКАЎ. **(Па тэлеграфу ад карэспандэнта «Звязды»).** На 14 сельсоветах пачаліся справаздачна-перавыбарчыя сходы. Сходы праходзяць з вялікім уздымам. Яўка выбаршчыкаў усюды перавышае 90 проц.

Па справаздачах райвыканкома і сельсоветаў разгортваецца большэвіцкая крытыка.

На перавыбарчым сходзе ў вёсцы Шараеўка, Шараеўскага сельсовета, з 168 выбаршчыкаў з'явілася на сход 163. Такая добрая яўка забяспечана арганізацыяй спецыяльных яслей і добра праведзенай арганізацыйна-растлумачальнай работай.

На сход у вёску Шараеўка прышла дэлегацыя ўдарнікаў-калгаснікаў суседняга калгаса «Новы свет». Калгаснікі падарылі першаму сходу партрэт тав. Сталіна ў прыгожай раме, зробленай самім калгаснікамі. Памяшканне, дзе адбываўся сход, упрыгожана кветкам, лозунгамі, дыяграмамі, якія ілюструюць дасягненні мясцовых калгасаў і дасягненні СССР і БССР.

У новы склад сельсоветаў выбіраюцца лепшыя калгаснікі-ўдарнікі, чэсныя аднаасобнікі. На сходзе першага ўчастка вёскі Шараеўкі выбраны членам сельсовета **Ладыга Фёдар**—калгаснік-ударнік, які выпрацаваў 430 працадзён, **Гарачко Макрыда**—лепшая брыгадзірша калгаса імя Сталіна, **Гарохава Марта**—радавая калгасніца, выпрацавала 342 працадні.

Такія-ж ударнікі выбіраюцца народнымі засядацелямі ў сельскія суды і членамі рэвізійных камісій сельсоветаў.

У раёне ў сувязі з перавыбарамі перадавыя калгасы здаюць звыш плана высокай якасці лён.

ФОНКАЦ.

ФІЗКУЛЬТУРУ—У КАЛГАСЫ

Пісьмо маладых калгаснікаў калгаса імя Закоўскага — удзельнікаў фізкультурнага спаборніцтва ў Менску — з'яўляецца знаменальным дакументам нашых дзён. Выступленне калгаснікаў-фізкультурнікаў ў невыпадкова. Яно—рэзультат тых агромадных поспехаў, якія мае калгас у барацьбе за заможнае і культурнае жыццё. Сапраўды, што мы бачым у калгасе імя Закоўскага? Маладыя калгаснікі расказваюць, што ў іх добрыя коні — гордасць усяго калгаса, якія раней былі толькі ў помешчыкаў, што на птушкаводнай ферме 2500 кур, што ёсць добрая свіная і малочная фермы. Ёсць пчэльнік, сад. Вочы-б пачнулі ад зайздрасці у багацця Язерскага, — гавораць у сваім пісьме хлопцы, — калі-б ён убачыў гэтыя багацці ў былых сваіх батракоў.

Але хіба мала такіх калгасаў у нас у БССР? Іх мы маем сотні. Хіба мала ў нас такіх брыгад, як брыгада тав. Дулі? Няхай-жа яны ў першую чаргу прымуць выклік спучнан.

Фізкультура — не забава. Фізкультура ў калгасе — гэта гігантскае культурнае дасягненне. Фізкультура робіць чалавека гібкім, здаровым. Фізкультура, асабліва футбол і валейбол, развіваюць пачуццё калектывізма, дысцыпліны, трапнасць удару і інтарэс да пытанняў тактыкі. Для многіх катэгорый калгаснікаў, праца якіх патрэбна адзінстайных рухаў доўгага сядзення (трактарысты, машыністы, якія працуюць на жнеярках і інш.). Фізкультура мае зусім выключнае значэнне.

Фізкультура — зорат п'яніі, дэбошаў, палавой распусты. Фізкультурай, як паказвае вопыт фабрык і заводаў, можна ахапіць усе слаі калгаснікаў — і хлапцоў і дзяўчат, і дарослых і нават пажылых. Але зразумела, што ў першую чаргу застрэльшчыкамі гэтай справы павінны быць моладзь. ВОСЬ ДЗЕ БАГАТАЕ ПОЛЕ ДЗЕЙНАСЦІ ДЛЯ НАШЫХ КОМСАМОЛЬЦАЎ. Вось дзе яны могуць абрасці новым моцным актывам.

Ухапіўшыся за фізкультуру, як за адно з рашаючых звенняў культуры, мы можам лёгка падцягнуць і ўсе астатнія звенні культработы. Аб гэтым наглядна сведчыць прыклад калгаса імя Закоўскага.

Тэму мы павінны дабіцца таго, каб У КОЖНЫМ КАЛГАСЕ БЫЛА АБСТАЛЯВАНА СПОРТПЛЯЦОЎКА У КОЖНЫМ КАЛГАСЕ НАПАДЖВАЛІСЯ ГУЛЬНІ Ў ВАЛЕЙБОЛ, А Ў БУЙНЫХ КАЛГАСАХ І Ў ФУТБОЛ. ЗІМОЙ У КОЖНЫМ КАЛГАСЕ МОЖНА І ТРЭБА АБСТАЛЯВАЦЬ КАТОК. АРГАНІЗАВАЦЬ ЛЫЖНЫ ГУРТОК.

Усе партыйна-совецкія органы, усе палітаддзелы, асабліва комсамольскія арганізацыі, павінны ўзначаліць арганізацыю гэтай справы. ЗАРАЗ-ЖА, ПАКУЛЬ ВОСЕНЬ, І КАЛГАСЫ МАЮЦЬ ВОЛЬНЫЯ РУКІ — ТРЭБА ПРЫНЯЦЦА ЗА АБСТАЛЯВАННЕ СПАРТЫЎНЫХ ПЛЯЦОВАК. Калі нават гэтай восенню мы не зможам іх дастаткова скарыстаць, яны будуць гатовы да вясны і лета, калі не будзе часу займацца іх абсталёўваннем. Трэба ўжо зараз набыць канькі і лыжы.

Паспяхова праведзены сельскагаспадарчы год дае ўсе матэрыяльныя магчымасці для росквіту фізкультуры. Тут, як і на ўсіх участках нашага соцыялістычнага будаўніцтва, мы яркі бачым розніцу паміж нашым жыццём і жыццём працоўных на Захадзе. Там голад, галеча, непасільныя падаткі. У нас—бурны ўздым усёй народнай гаспадаркі, шпаркі рост добрабыту і культурных запатрабаванняў народных мас.

Па-большэвіцку разгарнуўшы фізкультурны рух у калгасах, зробім буйны крок наперад па шляху пабудовы культурнага жыцця соцыялістычных працаўнікоў!

АДЗНАЧЫМ ОКЦЯБРСКУЮ ГАДАВІНУ МАСАВАЙ ЗДАЧАЙ ІЛЬНУ ВЫСОКАЙ ЯКАСЦІ

БРАЦЬ ПРЫКЛАД З ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ

(АГЛЯД ПІСЕМ КАЛГАСНІКАЎ)

Гадавіну Окцябрскай рэволюцыі перадавыя раёны, сельсоветы і калгасы рэспублікі сустракаюць завяршэннем ільнозагатовак. Поспех справы ў гэтых калгасах забяспечыла правільная арганізацыя працы і расстаноўка людзей. У гэтым пераканаліся калгаснікі калгаса «Гігант», Крупскага раёна. Тут на ільноапрацоўку было мабілізавана максімум рабочай сілы. Трапальшчыцамі былі пастаўлены лепшыя вопытныя калгасніцы. Сушыльна-мяльны пункт працаваў круглыя суткі. Асаблівая ўвага ў калгасе была звернута на правільнае налічэнне і аплату ільняных працадзён. Калгас «Гігант» закончыў апрацоўку і здачу валакна яшчэ 20 кастрычніка.

Такіх-жа паказальнікаў дабіўся калгас **«Ударнік прамысловасці»**, Дабрынянцкага сельсовета, Дзяржынскага раёна.

Індывідуальная здзельшчына на ільноапрацоўцы з'яўляецца важнейшым сродкам барацьбы за якасць прадукцыі. **Аб гэтым гаворыць у сваім пісьме калгаснік Сцефановіч з калгаса імя Чырвонай арміі,** Шаршунскага сельсовета, Заслаўскага раёна. Работа на аснове індывідуальнай здзельшчыны высока ўзняла выкананне норм выпрацоўкі. Трапальшчыцы Тарасевіч Тадора, Сокал Надзея, Жылач Ганька замест 8 кгр. вытропваюць у дзень па 12-13 кгр.

У калгасе вылучан прэміяльны фонд хлеба для лепшых ударніц ільноапрацоўкі. Прэміраванне праводзіцца кожную пяцідзённку.

Зусім працілеглы малюнак у калгасах Дубровенскага раёна.

Селькор Кручкоў паведамляе, што прычынай слабага ходу пераапрацоўкі ільну ў калгасах з'яўляецца дрэнная арганізацыя працы. Вось прыклад, калгас **«Прамень Кастрычніка»**, Дубровенскага раёна. На работу калгасніцы выходзяць толькі ў 12 гадзін дня, працуюць скопам. Работа кожнай мяльшчыцы і трапальшчыцы ў паасобку не ўлічваецца.

Падобныя сігналы ёсць з **Суражскага раёна.** У буйнейшым калгасе раёна **«Ударнік»**, як паведамляе **селькор Шчупін**, на ільноапрацоўку зусім не звернута ўвагі. Адказны па ільну Навасельскі Якаў пасе жывёлу. З ільноапрацоўкі кожны дзень знімаюцца калгаснікі. Усіх жанчын у калгасе 40, а на ільне занята толькі 12.

Тут ёсць і свая прычына, якая характэрна для большасці калгасаў раёна. У калгасе «Ударнік» калгаснікі неахвотна ідуць на апрацоўку ільну. Аб нормах выпрацоўкі тут ніхто не ведае. Лепшым ударнікам і лодырам запісваюць пароўні—адзіна працадзень.

Што-ж у гэты час робяць раённыя арганізацыі? У тым-жа Суражскім раёне, як паведамляе тав. **Касухін**, РК КП(б)Б амаль кожны дзень прымае пастановы аб ходзе ільнозагатовак, а канкрэтная арганізацыйная работа на мясцах не праводзіцца. На складзе аддзялення Заготільна ляжаць сотні тон хлеба для стымулявання ільнодатчыкаў, між тым калгасам, якія здаюць лён, хлеб не выдаецца. І гэта нікольскі не трывожыць РК КП(б)Б.

Арганізацыю ільноапрацоўкі ў калгасах падмянілі балбатнёй і ўва рэвіцыя раённыя арганізацыі. Няма таго пасяджэння бюро РК КП(б)Б, прэзідыума РВК і палітаддзела, як паведамляе тав. **Казіміраў**, каб на іх не гаварылі аб ходзе ільнозагатовак. Кожны раз прымаюцца пастановы, у якіх толькі канстатуюцца факты сабатажу ручной апрацоўкі і ўсё.

Прыклад перадавых гаворыць аб тым, што кожны калгас мае магчымасць у бліжэйшыя дні выканаць план ільнозагатовак.

АДЛЕЖКА ПАСЛЯ МЯЦЦЯ ПАЛЯПШАЕ ЯКАСЦЬ

Да здачы валакна наш калгас **«Чырвонае Сувалкава»**, Сосніцкага сельсовета (Полацкі раён), прыступіў яшчэ ў пачатку верасня. Я сумесна са старшынёй калгаса Міронам Сачыўка паставілі перад сабой задачу да 5 кастрычніка здаць ільновалакно дзяржаве.

20 жніўня мы падняслі са сцелішчаў цэнтнеры з чатыры трасты. Яе адразу ўлажылі ў сушню. Пасля прасушкі паставілі астываць і адразу пусцілі ў мялку. Якраз жаночая сіла ў нас была свабоднай і мы адразу пасля мялкі ўзяліся за трапанне. 3-га верасня мы прывезлі першую партыю ваўзяліся за трапанне. 3-га верасня лён здаваць я (як намеснік па ільну) і лепшая трапальшчыца Штангалева Таццяна.

Выглядаў лён вельмі добра. Прыёмшчык, прымаючы гэты лён, пачаў раскладваць яго на два гатункі. **Зважыўшы першыя 63 кілограмы, прыняў 11-м нумарам, а 57 кг. прыняў 7-м нумарам.**

Я, як адказны па ільну, зацікавіўся, чаму гэта як быццам адзін і той-жа лён часткай прынят у сёмы нумар, а часткай у адзінаццаты. У адказ мне прыёмшчык запытаў, **калі** мы яго трапалі. Я адказаў, што трапалі ўсё адразу.

Аказваецца, што першую партыю мы адразу з мяльнай машыны ўзялі трапаць, а **пакуль вытрапалі першую частку, то астатняя астыла, адляжала крыху, і стала лепш вытропвацца, даўшы лепшае валакно.** І рашыў я перабудаваць усю работу па апрацоўцы ільну так, каб **даць ільну адляжацца пасля мялкі.** Прышлося трапанне спыніць на два дні. Праўда, на мяне прабавалі крычаць, але я вылічыў, што гэта не пашкодзіць скалічэнню здачы валакна да 5 кастрычніка, так, як мы абавязаліся. Па плану мы павінны былі вытропваць у дзень 60 кілограмаў. Я-ж вылічыў, што калі траста пасля мяцця адляжыць дзень, мы зможам вытропваць гэтымі-ж людзьмі не 60 кілограмаў, а цэнтнер у дзень. Мой разлік сапраўды аказаўся правільным: за два дні я загатовіў запас трапальшчыцам больш чым на 6 дзён і гэта дало нам магчымасць каб валакно пасля мяцця адляжала.

Пасля гэтага я гэтых-жа жанчын паставіў на трапанне. Аказваецца, што і якасць палепшылася і трапальшчыцы пачалі вытропваць значна больш, чым раней.

У нас максімум вытропвалі ў дзень 5 кілограмаў, пасля таго, як лён пасля мяцця адлежваў тры дні, пачалі вытворчасць на 7 кіло, а некаторыя (Штангалева Таццяна і іншыя) вытропвалі па 10-11 кілограмаў.

Пасля таго як мы арганізавалі адлежку ільну пасля мяцця, не было ніводнага факта, каб мы здавалі валакно ніжэй 10-9 нумара. Якасць валакна значна павысілася. Адлежка валакна дала нам магчымасць да 5 кастрычніка другімі па раёну закончыць здачу валакна на 100 проц. і здаць звыш плана 2 цэнтнеры валакна 11 нумарам у падарунак з'ездам советаў.

Нам. старшыні па ільну калгаса «Чырвонае Сувалкава», Сосніцкага сельсовета, Полацкага раёна.

ПРАКОФ'ЕЎ ПЕТР.

АД РЭДАКЦЫІ.

Пісьмо тав. Пракоф'ева наглядна паказвае, якое агромаднае значэнне мае адлежка трасты пасля мяцця для якасці валакна.

Разам з тым гэта пісьмо лішні раз паказвае, што ні раённыя арганізацыі, ні палітаддзелы не кіруюць спрэвай укаранення агратэхнічных правіл апрацоўкі ільну ў калгасах. Інакш тав. Пракоф'еву не прышлося-б ВЫПАДКОВА не здатачным пункце даведацца аб такой элементарнай рэчы, як адлежка ільну пасля мяцця. Калі-ж нарэшце ў Полацку і ў іншых раёнах па-большэвіцку возьмуцца за арганізацыю справы барацьбы за высокую якасць ільну?

Раўняцца па Меншчыне!

Менскі раён першым у БССР выканаў і поўнасцю выканаў план здачы ільнапрадукцыі, здаўшы валакно высокай якасці.

Што забяспечыла першаму Меншчыне, яким чынам Менскі нейльнавочны раён выйшаў на першае месца па ільну?

Першае — гэта тое, што кіраўніцтва Менскага раёна здолела арганізаваць правільнае выкананне дырэктыў ЦК і СНК аб апрацоўцы і загатоўках ільну. Больш Меншчыны не спасылаліся на розныя «аб'ектыўныя» прычыны, а мабілізавалі масы калгас нікаў і працоўных аднаасобнікаў на перамаганне труднасцей.

У Меншчыне, як і ў радзе іншых нейльнавочных раёнаў, напрыклад, не хапае бўняў. Але тут знайшлі выхад. У калгасе «Новы быт», Крупіцкага сельсовета, быў уведзен так званы літоўскі метад сушкі без бўняў. Ёўню тут замянілі своеасаблівая печ, выкапаная ў зямлі. Адна такая печ забяспечвала работай 7 мялышчыц і 7 трапальшчыц. Калгас «Новы быт», дзякуючы гэтаму метаду за два тыдні поўнасцю апрацаваў і здаў лён 13-14 нумарам. Вопыт калгаса «Новы быт» адразу стаў здабыткам большасці калгасаў раёна. Гэта значна паскорыла апрацоўку і здачу прадукцыі.

На лён з самага пачатку былі вылучаны спецыяльныя звенні, якія ўвесь час займаліся апрацоўкай. У радзе калгасаў: імя Войкава, «Ударнік», «Зара» і інш. была арганізавана круглагадзінная апрацоўка. Вялікая ўвага была звернута на налічэнне ільняных працадзён. За выкананне нормы, як правіла, налічваліся па два працадні. Гэта стымулявала тэмпы і якасць апрацоўкі.

Кіраўнікі Менскага раёна не спазняваліся на самацёк, а арганізоўвалі апрацоўку ільну на месцах. Сельсоветам, калгасам даводзіліся пяцідзённыя заданні, выкананне якіх правяралася рэгулярна. У апошні час на апрацоўку ільну было пераключана 75 проц. рабочай сілы калгасаў. У выніку апошнія тры пяціднёўкі кастрычніка давалі па 25 проц. прыросту кожная.

Немалую ролю адыграла запісенне «Праўдой» Менскага раёна на ўсесаюзную чырвоную дошку. Гэта яшчэ больш спрыяла разгортванню соцыялістычнага спаборніцтва ў калгасах за датэрміновае выкананне ільнозагатовак, за паспяховае завяршэнне сельска-гаспадарчага года.

Прыклад Меншчыны — яркае пацвярджэнне таго, што мы маем усе магчымасці датэрмінова здаць высокакласны лён дзяржаве.

Усе раёны, сельсоветы і калгасы павінны раўняцца па перадавому Менскаму раёну!

ЯК МЫ ЗМАГАЕМСЯ ЗА ЛЁН

Якасць ільну правералася не столькі на пункце, колькі непасрэдна ў калгасе. Менскі райсаюз не ператвараўся ў простага прыёмшчыка. Разам з парторгамі, старшынямі сельсоветаў, сельпо была праверана расстаноўка сіл на мяльна-трапальных пунктах калгасаў.

Райспажыўсаюз, атрымаўшы хлеб для ільназдатчыкаў, не чакаў, пакуль калгасы пасдуць яго атрымліваць, а на сваёй грузавой машыне развёз гэты хлеб па калгасах. У кожным калгасе была пасланая шкала, на якой было адзначана колькі калгас павінен атрымаць хлеба, грошай, промтавараў за зданую дзяржаве ільнапрадукцыю. У шкале было ўказана, колькі хлеба калгасы атрымаюць пры здачы вышэйшага або нізейшага нумара.

У лепшых трапальшчыц або брыгадзе па трапанню ільну сельпо брала папярэднія заказы на промтавары. Улічвалася, якую мануфактуру кожны хоча мець. За раз ужо брыгада калгаса «Новы свет» атрымала свой заказ—паркаль яркіх фарбаў, палатно ў клетку і т. д. Большасць сельпо заключылі з калгасамі дагаворы на выдачу прэмій проз і продтаварамі за перавыкананне норм трапання. Райспажыўсаюз у якасці падарунка да окцябрскіх свят адгрузіў лепшым ударнікам калгасаў селядцы, цукар, мануфактуру і іншыя тавары.

Зараз, выканаўшы план ільнозагатовак і заданне па закупках хлеба, менскі райспажыўсаюз прымае спецзаказы да окцябрскіх свят.

Пад кіраўніцтвам і пры канкрэтнай дапамозе райкома партыі райспажыўсаюз так перабудаваў работу сельпо, каб яна была накіравана на выкананне ўсіх гаспадарча-палітычных задач.

С. Ц.

АДКРЫЎСЯ ЗЛЁТ ЗНАТНЫХ ЛЮДЗЕЙ ЛЯСНОЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Учора адкрыўся ўсебеларускі злёт знатных людзей лесу, сплаву і падсочкі. Пасля выбрання кіруючых органаў злёт заслухаў даклад ушаўнаважанага Наркомлеса тав. Розіна аб выкананні праграмы 1934 г. па лесазагатоўках, лясной гаспадарцы, сплаву і падсочцы, і аб задачах знатных людзей, і даклад тав. Мархашова аб культурна-бытавых умовах і соцспаборніцтве.

На злёт прыбыла 98 дэлегатаў. У якасці гасцей прысутнічаюць дырэктары перадавых леспрамгасаў, начальнікі ўчасткаў, старшыні калгасаў, старшыні райкомаў саюза.



Калгас «Чырвоны пераменнік» па прыкладу калгаса імя Закоўскага арганізаваў спартыўную вучобу. Злева направа: 1) Калгаснік трэніруецца на турніку. 2) Калгаснік ДУЛЯ ВЛАДЗІМІР (калгас імя Закоўскага, Слуцкі раён) практыкуецца на знарадах. Тав. Дуля — капітан футбольнай каманды калгаса. 3) Голкіпер футбольнай каманды калгаса імя Закоўскага (Слуцкі р.) МІША САКОВІЧ.

ПІСЬМО МАЛАДЗЁЖНАЙ ФУТБОЛЬНАЙ КАМАНДЫ КАЛГАСА ІМЯ ЗАКОУСКАГА

Да ўсіх маладых калгаснікаў, калгасніц і працоўнай аднаасобнай моладзі Совецкай Беларусі

Маладыя таварышы! 18 кастрычніка на Менскім стадыёне «Дынамо» адбыўся футбольны матч-спаборніцтва паміж двумя камандамі калгаснікаў - футбалістаў. Пер можцам выйшла наша каманда тав. Дулі з калгаса імя Закоўскага, Слуцкага раёна.

Гэта быў для нас радасны, вялікі дзень. На стадыёне кожны трапны ўдар узнагароджваўся воплескамі. Палыхалі сцягі, і мы ішлі на мяч весела і дружна. Мы кідаліся за ім навыперадкі, нібы ў дзяцінстве.

Цяжкім і бязрадасным было наша дзяцінства.

Шчаслівым і прыгожым стала наша юнацтва.

Багатым і славутым на ўсю Совецкую Беларусь вырас наш калгас імя Закоўскага. Наш жарабец брабансон «Гога» весела іркэ на лузе і рые капытамі зямлю. Ён здаецца вылітым з чорнай сталі. Сямён Міхайлавіч Будзённы не мог наглядзецца на яго. І такіх коней у нас 40. «Буян» пасецца па полю, як віхор жоўтага полымя. Толькі старшы конюх-кавалерыст Старынчык ды капітан нашай футбольнай каманды Дуля могуць яго асядлаць.

Лепшая ў калгасе наша маладзёжная брыгада Уладзіміра Дулі. Дуля выпрацаваў 200 працадзён. Наш галкіпер Басалыга — 250, а форвард Смольскі, Коля—рулявы жняркі—аж 325. Стала ў нас столькі грошай і хлеба, што прыйшлося думаць, што з імі рабіць. **Дуля, Заец, Саковіч і Альховік купілі сабе веласіпеды. 7 веласіпедаў купілі сабе нашы калгаснікі.** Цяпер па нашай вуліцы веласіпед убачыш часцей, чым воз.

Надакучыла нам адзін гармонік **і арнсйчы на сходзе моладзі мы рашылі—возьмемся за фізкультуру.** Было гэта яшчэ вясной. Сабралася нас некалькі актывістаў, купілі мы сабе фізкультурныя касцюмы, валейбольны матч, сетку. І пачалі. **Каля пчольніка ў садзе мы зрабілі пляцоўку, якая хутка стала цэнтрам усяго калгаса.** Сюда мы перацягнулі гармонік, тут праводзіліся ўсякія сходы, тут спявалі і адпачывалі. І тут быў заключан наш дагавор аб спаборніцтве па сяўбе і па ўборцы з брыгадай Кармана.

Тысячы вачэй сачылі за намі з трыбун стадыёна ў часе нашага матча ў Менску. Тут былі старыя і маладыя. Калі глядзіш на гэты стадыён, мімаволі ўспамінаецца: зрабіць пляцоўку аказалася справай лёгкай. Мы самі паставілі слупы і вароты. Наш калгасны каваль вы каваў нам кольцы і турнік. Скончыўшы сяўбу, мы набылі футбольны мяч.

Спярша футбол не падабаўся вёсцы.

— Лепш-бы вакол поля бегалі ды цялят у шкода не пускалі,— гаварылі бабы.

Старому паляводу Мітрафану Гурыновічу таксама не падабалася:

— Яшчэ ногі зломіце, ну вас, хлопцы...

А потым стаў прыходзіць да нас, ганяць мяч і старэйшы сейбіт Сцяпутка. Адпойчы цыпнуў, каб стаць галкіперам Гурыновіч. Увосень мы гулялі з вайсковай камандай, а потым выклікалі па матч брыгаду Кармана. Матч гэты цікавіў нас усіх. Часта форварды абодвух камандзіралі трэніроўку і ехалі вазіць снапы. Часта, не паспеўшы зняць бутцы, прыходзілася ісці ў іх па мяккай баразне зяблева.

Але вось надышло 18 кастрычніка, і на Менскім стадыёне ідзе наш матч, адзначаны рабіным чырвоным абозам хлеба.

Мы адчулі, што азначае захапляючы, здаровы спорт. Мы зразумелі, чаму абагаляюцца воплескамі трыбуны пасля кожнага ўдара. Гэта там, на матчы, мы цвёрда рашылі вучыцца далей, не забываць фізкультуры. **Зараз мы ўжо купілі 25 пар лыж і будзем трэніравацца, каб зрабіць да з'езда Совецкаў першы ў Беларусі калгасны лыжны прабег у Менск.** У бліжэйшы час мы налаўчаем дыскут па рэчаму «Падпятая цаліна». У нас будуць налажаны культ-вікторыны, гурткі, палітбаі. Будзем трэніравацца, каб кожны мог адказаць на ўсякае пытанне таксама лоўка і трапна, як ён ганяе мяч.

Таварышы маладыя калгаснікі і калгасніцы! **Тое, што зрабілі мы, няцяжка зрабіць у кожным калгасе.**

Таварышы маладыя калгаснікі і калгасніцы! Зараз мы падзяліліся ўраджай і скончылі асноўны цыкл паливых работ. Зараз мы з вамі заможныя і вольныя. **Давайце скарыстаем зімовы час на вучобу, ка спартыўную трэніроўку, на культурнае ўзбраенне. Не будзем жа адставаць ад нашай эпохі,** якая ідзе вялікімі крокамі па шляху культурнага росту. Арганізуйцеся як мы, прыступайце да справы з энтузіязмам—і вы будзеце пераможцамі. **Няхай у нас будуць сотні футбольных калгасных камандаў. Няхай у нас будзе ўсебеларуская збориая калгасная каманда футбалістаў, выпрэніраваных майстроў спорту.** І мы будзем спаборнічаць з другімі рэспубліканцамі.

Калі мы возмемся за працу, у нас будуць калгасныя лыжнікі, якія не пабаяцца ісці ў прабег праз усю краіну, у нас будуць калгасныя майстры-шахматысты. На канцэртах у калгасных дамах соцкультуры ў нас будуць выступаць калгасныя артысты. Сярод нас будуць жыць паэты калгаснікі. Слова «хата-мастацкая студыя» стане такім-жа агульнаўжывальным, як «хата-чытальня». Талаўты ўжо жывуць у нас, сярод нас, і шырокую вольную дарогу адкрываюць ім партыя, совецкая ўлада. Шлях шчасця, шлях навукі, шлях да будучага ляжыць перад намі.

Футбалісты-калгаснікі:
В. ДУЛЯ, В. ГУК, А. ДЕШОНАК, І. КРАСУЦКІ, М. СМОЛЬСКІ, А. ШАРАМЕТ, П. КРАСУЦКІ, А. МАХЛАЙ, М. САКОВІЧ, А. БАСАЛЫГА, А. КРАСУЦКІ.

БЕЛАРУСКІ ПОЛІТЭХНІЧНЫ ІНСТЫТУТ ВЫПУСКАЕ 12 ІНЖЫНЕРАЎ ПІРАГЕНЕТЫКАЎ

Большэвіцкае прывітанне выпускнікам!

ПЕРШЫ ВЫПУСК

28-29 кастрычніка г. г. дзяржаўная кваліфікацыйная камісія НК мясцовай прамысловасці выпусціла 12 маладых інжынераў пірагенетычнай спецыяльнасці з ліку студэнтаў Беларускага політэхнічнага інстытута.

Гэты выпуск мае вялікае значэнне для далейшага росту народнай гаспадаркі БССР і яе індустрыялізацыі.

Выпускнікі прадставілі дыпломныя работы і праекты тых ці іншых прамысловых пірагенетычных установак. Сярод іх павінны быць асабліва адзначаны работы: тав. Пракаповіча «Газагенератарная станцыя змешанага газу» (на 1.000 тон пераапрацоўкі торфу ў суткі). Работа гэта прызнана кваліфікацыйнай камісіяй найлепшай і падлягаючай прэміраванню, тав. Крывасова—«Газавы завод для атрымання вадзянога газу з коксу»; тав. Мікалаяновіча—«Газавая станцыя на падмаскоўных каменных вугалёх»; тав. Каткоўскага—«Смоларазгонны завод для мельскага піклозавода»; тав. Сініцына—«Двайны вадзяны газ з торфу для прапойскага хімкамбіната» (ў колькасці 270 млн. куб. м. у год) і інш.

Трэба пажадаць, каб маладыя інжынеры-пірагенетыкі атрымалі належную сустрэчу ў тых установах, да якіх яны замацаваны.

Прывітанне і пажаданне вялікіх поспехаў на практычным шляху дзейнасці маладых інжынераў пірагенетыкаў.

Дырэктар інстытута торфу БелАН БАХЦЕЕЎ.

НОВАЕ ПАПАЎНЕННЕ

Новае папаўненне каманднага складу соцыялістычнай прамысловасці дае сёння Беларускі політэхнічны інстытут.

12 новых інжынераў па спецыяльнасці хімічнай пераапрацоўкі ўсіх відаў цвёрдага паліву пакідаюць сцены інстытута, уступаюць у рады дзейнай арміі совецкай тэхнічнай інтэлігенцыі.

За гады соцыялістычнага будаўніцтва разам з усёй прамысловасцю СССР хімічная пераапрацоўка паліва стала адным з важнейшых энергетычных і сырцовых участкаў.

Такія гіганты пяцігодкі, як Уралмаш, Касагорск, Ніжні-Тагільскі, Беразнікоўскі, Бобрыкі, Кузнецкі, Красна-Уральскі, Чэлябінскі, Бакальскі і многія інш. заводы прымяняюць або ў якасці асноўнага паліва, або сырцу толькі аблагароджанае паліва (ў выглядзе коксу і газу). Для задавалення патрэбнасцей гэтых гігантаў пабудаваны аграмадныя заводы па газафікацыі і каксаванню. Але не толькі колькасна вырасла гэта прамысловасць, вырасла яна і якасна. Асвоены новыя працэсы. Вытворчасць механізуецца. Ужо амаль не існуе заводаў без утылізацыі пабочных прадуктаў. Асвоена прамысловая пераапрацоўка новых відаў цвёрдага паліва: торфу, бурага вугалю, сланцоў і сапрапелаў.

Калі яшчэ некалькі год таму назад хімічная пераапрацоўка торфу лічылася праблемай, то ў цяперашні час гэту галіну прамысловасці прадстаўляюць такія буйныя газавыя заводы, як пры Уралмашы, Горкаўскім, у Гусь-Хрустальным, Гомелі і многіх інш. Пабудавана буйная коксавая ўстаноўка ў Разыкіна (пад Масквой) на 5.000 тон коксу з торфу ў год. Прамыслова асвойваецца пераапрацоўка тарфяных смол у каштоўныя хімічныя імпартныя прадукты: нол, крэзол, парафін, воск і інш. Пабудавана вопытная ўстаноўка па газафікацыі пылевіднага торфу. Намячаецца прамысловае ажыццяўленне атрымання высокакаларыйнага газу з торфу для сінтэза аміяка і бытавых патрэб.

БССР—тарфяны Данбас. Палі БССР адчуваюць велізарную патрэбнасць у азоцістым угнаенні. Гарады БССР, у першую чаргу Менск, адчуваюць патрэбнасць у танным і выгодным у транспартаванні паліве.

БССР усе гэтыя патрэбнасці можа задаволіць за кошт тарфяных балот. Прамыслова гэта не прадстаўляе зараз праблемы, і на другую пяцігодку па БССР запраектавана будаўніцтва прапойскага хімкамбіната, газафікацыя горада Менска і інш. Адчувалася аграмадная патрэбнасць у высокакваліфікаваных кадрах, і гэтыя кадры дае сёння Беларускі політэхнічны інстытут.

Перад выпускнікамі—новымі совецкімі інжынерамі-пірагенетыкамі — паўстае грандыёзная і ўдзячная задача.

Балоты, якія невуцкая і ляніва, кабальная і барская царская Расія ахрысціла «няўдобнымі землямі» і выкрасліла з інвентара багацтваў прыроды, прымусіць служыць на карысць соцыялістычнай радзіме і яе вялікіх спраў.

Інжынер ПРАКАПОВІЧ.

Інжынер М. А. КІЕНЯ

ШТО Я УБАЧЫЎ У СВАЕЙ ВЁСЦЫ

У 1919 годзе пакінуў сваю родную вёску Дамантавічы вядомы хлопец Макар Кіеня. З тае пары толькі арэлку ўдавалася яму наведаць сямю, набываць у сваёй вёсцы. Франты грамадзянскай вайны, работа ў большэвіцкай партыі, вучоба пяжкая, але захапляючая праца інжынера кідалі яго з канца ў канец нашай неабсяжнай краіны, адрывалі ад пытоменных спраў роднай вёскі.

Найвялікшыя пераўтварэнні адбыліся за гэты час у жыцці Макара Кіеня. Дыктатура пролетарыята, развязаўшая творчыя сілы працоўнага народу, выдзяляючая дрэмаўшыя пад векавым спудам эксплуататарскага ладу творчыя таленты сынаў гэтага народу выявіла незаўважаны талант гэтага з бычайнага вясковага юнака і дала яму найшырэйшыя магчымасці праявіць і раскрыцець. І мастэр пабудаваў інжынер Макар Александравіч Кіеня. Сярод іх такія гіганты, як жалезабетонны мост даўжынёй у 1.625 метраў праз Дняпро і вядомы красавец, гордасць совецкага мостабудаўніцтва — мост праз Оку.

І вось пасля доўгіх гадоў наведаў Макар Александравіч Кіеня —славуты совецкі інжынер, узнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі, сваю родную вёску Дамантавічы.

Найвялікшыя пераўтварэнні адбыліся за гэты час у жыцці вёскі: Стала вёска Дамантавічы калгасам «Чырвоны дырыжабль».

Змяніўся спосаб вытворчасці. Зніклі межы, закінула калектыўная, арцельная работа—і рэзка ўзнялася прадукцыйнасць працы. З'явіліся суадносіны людзей на вытворчасці, ліквідаваны кулацтва разгарнулася соцыялістычная работа агрэдаванымі прыладамі на зямлі совецкай дзяржавы, і бальшыя бедняки, якія заўсёды перабіваліся з хлеба на ваду, разам з былымі серадняками, якія станоўчыя заможнымі калгаснікамі. Здольны інжынер — арганізатар складанейшай вытворчасці — не мог не заўважыць гэтага.

У сваёй вёсцы сустрэўся Макар Кіеня са старымі сваімі адносінамі, са старымі знаёмымі-суседзямі. Усё гэта тыя-ж людзі, але якія ўсе яны іншыя. Ён убачыў людзей — арганізатар калгаснай вытворчасці, якія прагна цягнуцца да культуры, людзей, гордых за сваё новае жыццё і за сваю знойдзеную бальшавіцкую. Іван Кіеня, купіўшы сабе кларнет, і з вялікім захапленнем працягваючы дрот ад радыёпрыёмніка ў сваю хату—ці гэта не характарэнны представнік новай вёскі? І чалавек высокай культуры — інжынер-пуцеец, не мог не заўважыць гэтых каранных перавтварэнняў у вёсцы.

Вёска Дамантавічы дала краіне не адзіна толькі Макара Кіеню. Доктар Галушка, аграном Шаравараў, некалькі настаўнікаў і студэнтаў выйшлі з яе хат.

Тысячамі нітей звязана вёска Дамантавічы з усёй совецкай краінай, і сваю герайчную калгасную працу разглядаюць калгаснікі як частку агульнага, соцыялістычнага будаўніцтва.

— Не толькі мы будаўнікі, але і мы будуем соцыялізм. Як горда гучаць гэтыя словы, які вялікі сэнс хаваюць яны ў сабе.

Няма ўжо былой вясковай абмежаванасці, няма ідыётызму вясковага жыцця. Вёска бурліць жыццём, і вясковы жыхар адчувае сабе грамадзянінам. Ён адчувае сабе сынам сваёй соцыялістычнай бацькаўшчыны.

Расказ інжынера Кіеня аб тым, што знайшоў ён у роднай вёсцы пасля доўгай адлучкі, характэрны тым што ён яркі паказчык не толькі сямі Дамантавічаў, гэты расла малое шлях тысяч такіх Дамантавічаў, шлях нашай совецкай вёскі.

Нядаўна я правёў некалькі дзён у калгасе «Чырвоны дырыжабль», Лешнянскага сельсовета, Капыльскага раёна — былой вёсцы Дамантовічы. Роўна сем год не быў я ў роднай вёсцы, у якой вырас, прапаваў і вучыўся. Сем год — невялікі тэрмін. Але якія гіганцкія зрухі адбыліся за гэты час.

Дамантовічы была звычайнай беднай беларускай вёскай... дзе кожны жыў сваімі вузкімі індывідуалістычнымі інтарэсамі, дзе цвёрда размяжоўвалася «маё — тваё», вёскай, дзе кожны чапляўся за сваю вузкую палоску зямлі і гатоў быў затрымаці суседа, заарэшчата чужую мяжу. Памятаю: яшчэ хлапчуком, не ўмаўшы добра аўладаць плугам, я заехаў на чужую палоску. Ну, і дасталося мне ад суседа.

Выключна прапавітым народам былі дамантовіцкія сяляне. Тым не менш вёска мала чым адрозніваліся ад суседніх жабрацкіх вёсак. У многіх сялян з года ў год не хапала хлеба. Не менш 15 гаспадарак з 40 жылі ўпрогалодзь. Так жыў і мой таварыш, з якім разам пасеў я гутарыў, амаль з усімі калгаснікамі. Ніхто з іх не сказаў, што жыць горш, чым да калгаса. Наадварот, усе заяўляюць, што іх становішча значна лепшае, чым раней.

Няма чаго гаварыць аб бедняках; але і серадняки, якія раней зводзілі канцы з канцамі — Іван Якубавіч Кіеня, Нічыпар Шаравар (Есіпаў), Дзям'ян Нікалаеня — на справе адчулі перавагі калгаснага ладу. Аб гэтым гаворыць іх заявы, аб гэтым сведчаць і падлікі іх даходаў.

Іван Кіеня ўжо на працягу трох год мае найбольшую колькасць працадзён у калгасе. Ён зарабіў у гэтым годзе больш 250 пудоў хлеба. Ніколі раней ён столькі не меў.

Перавагі калгаснага ладу выяўляюцца перш за ўсё ў росце прадукцыйнасці працы. Я азнаёміўся з нормамі калгаснік на ўборцы бульбы. І вось адна калгасніца выкопвае столькі бульбы, сколькі раней два чалавекі. У гэтым годзе жалі сярпом усё жыта за тры дні, а раней на гэта трацілася не менш 10-15 дзён. Прадукцыйнасць працы настолькі падняслася, што ў калгасе ёсць шмат вольнай рабочай сілы. Многім з маладых калгаснікаў можна было паехаць на будаўніцтва. Але ніхто не хоча выехаць — добра жывецца і ў калгасе.

Лепшае жыццё ў калгасе лепш за ўсё агітуе супроць індывідуальнай гаспадаркі. Восенню 15 новых гаспадарак уступілі ў калгас. Увайшла ўся вёска за выключэннем аднаго Захара Мікалаені.

Рост добрабыту выклікае небывалую цягу да культуры. Іван Кіеня, аб якім я ўжо гаварыў, купіў музычны інструмент — кларнет за 450 руб. Хто ў старых Дамантовічах мог дазволіць сабе такую роскаш? Іван збіраецца ў гэтым годзе пабудаваць новую хату і купіць радыё-прыёмнік. Дзіўная прагнасць да культуры ў Івана Кіені. Я прыйшоў у падарунак сваёму брату чатырохламповы радыё - прыёмнік. Даведаўшыся аб гэтым, Іван пабег у суседні сельсовет, здабыў педзе навушнікі і дрот і на працягу аднаго дня злучыў дротам сваю хату з нашай (мы суседзі). І пяцер уся яго сям'я з незвычайным захапленнем слухае радыё. Іван прасіў мяне прыслаць яму таксама рэпрадуктар.

Амаль усе сем'і выпісваюць газеты.

Памятаю раней, калі праводзілі моладзь у армію, дык горкімі слязамі абліваліся маткі і жонкі, праводзілі з плачам, напіваліся самагону ўсе ад малога да старога. Цяпер провады прызыўнікоў у Чырвоную армію сталі калгасным святам. Яны прайшлі з вялікім задакладам. Сабралася ўся моладзь, быў праведзен мітынг, граў аркестр.

Мне давялося быць маўклівым сведкай цікавых спрэчак, якія ілюструюць гіганцкі рост свядомасці калгасных мас. У хаце майго брата спрачаліся — Цярэнці Кіеня і Аляксандр Галушка. Аляксандр даказваў, што культура мала падняслася, у калгасе нехапае тавараў, усё ідзе ў горад. А Цярэнці Кіеня пярэчыў. Ён даказваў адваротнае. Раней ні ў адной хаце не было фіранак, цяпер іх мае больш паловы хат. Ні адзін селянін не выпісваў газеты, а цяпер газету атрымлівае кожны. Галушка не здаваўся. Ён уступіў толькі тады, калі Цярэнці цны агульным смеху напомніў яму пра яго ўласнае жыццё: «Памятаеш, на вяселле ехаў у дыматканых штанах, а цяпер і на работу ходзіш у фабрычных». Пасля гэтага Галушка здаўся.

Многія нашы хлопцы выйшлі ў людзі. Сын Івана Галушкі стаў доктарам, адзін з Шараваравў (Есіпавых) — агрэнамам, ёсць настаўнікі, адна дзяўчына вучыцца ў медычным тэхнікуме. 10-12 хлапцоў і дзяўчат вучацца ў сямігодцы. А калісці я быў адным хлопцам, які вучыўся ў сярэдняй школе. Правяраў я веды малога Васіля (сын Чубатавага Якуба). Чэснае слова, ён не ўступіць маскоўскім школьнікам.

Так расце культура ў калгасе, так пераадоліліся на маіх вачах людзі. З выключным заслужаным гонарам заяўляюць калгаснікі: «Не толькі вы будаўнікі, але і мы будуем соцыялізм». Гэты гонар — наглядны рэзультат вялікай работы, праробленай у калгасе, карэнных змен у палітычных поглядах калгаснікаў.

Калгас «Чырвоны дырыжабль» выхаваў нямала энтузіястаў соцыялістычнай працы.

Цярэнці Кіеня — былы серадняк. Яму ўжо пашоў 52 год. Ён адзін з арганізатараў калгаса «Чырвоны дырыжабль». У 1930 г., пасля перагібаў у правядзенні калектывізацыі, калгас распаўся, асталіся 6 беднякоў і ён — адзін серадняк. Якое велізарнае перараджэнне павінен быў перажыць гэты стары селянін, каб ва ўмовах страшэннага цкавання і варожасці ў роднай сям'і і з боку сваіх суседзяў астацца ў калгасе, умацаваць яго і дажыць да дзён росквіту. Для гэтага трэба было быць героем.

Дзем'ян Нікалаеня асабліва ганарыцца поспехамі калгаса. Усе гады грамадзянскай вайны са зброяй у руках на паўднёвым і ўсходнім франтах абараняў ён краіну Совецаў. І цяпер у кожнай перамозе калектыўнай працы Дзем'ян бачыць плады сваіх намаганняў, сваёй упартай барацьбы са шматлікімі белагвардзейскімі бандамі.

Энтузіястам калгаснай працы з'яўляецца і мой брат Васіль Кіеня. У кожным пісьме да мяне ён дзеліцца поспехамі роднага калгаса, падкрэслівае, што ён задаволен сваім жыццём, ганарыцца тым, што будуе соцыялізм. І яму сапраўды жывецца непараўнана лепш, чым раней. Пралаўшы вакаперацыі свой хлеб ён купіў веласіпед. Набыць веласіпед было калісці маёй марай. Бацька ніяк не мог сабраць грошай, каб купіць яго. І я так і не дачакаўся ажыццяўлення сваёй мары. А брат цяпер прадаў толькі частку лішкаў хлеба і купіў веласіпед.

Іван Якубавіч Кіеня ўвесь вольны час аддае калгасу. Ён мае больш за ўсіх працадзён. Ён то пчол разводзіць, то капканы на харкоў ставіць, то, навучыўшыся шклярнай справе, устаўляе шыбы ў калгасныя хаты.

Адзін комуніст у калгасе — гэта тав. Лапоцька, старшыня праўлення. Лапоцька карыстаецца вельмі вялікім аўтарытэтам, пашанай і любоўю сярод калгаснікаў. Гэта любоў адчуваецца на кожным кроку.

Ёсць у «Чырвоным дырыжаблі» свае нішкі. Яны зарабляюць не менш, чым раней, але іх цісну ць перажыткі ўласніцкай псіхалогіі яны цягнуцца прапоўнай дысцыпліной. З кожным годам такіх нішкаў робіцца ўсё менш. Іх неадаваленню часамі спрыяюць нячулыя адносіны праўлення калгаса. Адзін з нішкаў Павел Салаўёў — хворы. Яму патрэбна дыетычнае харчаванне. Карова малака не дае, а праўленне не гледзячы на ўсе магчымасці, малака не адпускае. Больш чулыя адносіны да патрэб кожнага калгасніка значна ўзнялі б агульны настрой калгаснікаў.

Не хачу закрываць вачэй на тыя недахопы, якія яшчэ ёсць у калгасным будаўніцтве. У калгасе «Чырвоны дырыжабль» раскулачылі двух грамадзян: Александра Галушку і Сямёна Кіеню (Саўчукова). Я добра ведаю абоих. Людзі выключна працавітыя, ніколі не карысталіся наёмнай працай. Сямёна раскулачылі таму, што ў 1924 годзе, калі рабочых рук у сям'і не хапала, ён наймаў аднаго хлопчыка.

Яму таксама ўспомнілі, што калісці, пры першапачатковай арганізацыі калгаса ён назваў калгаснікаў гультаямі. Потым Сямёна абклалі цвёрдым заданнем, ён яго выканаў, прасіў прыняць у калгас. Замест прыёму яго раскулачылі. Між тым, гэты Кіеня 20 год працаваў батраком у маёнтку. А Галушка ў 1917-18 г. актыўна змагаўся за ўладу совецаў.

Трэба выправіць дапушчаныя памылкі і адкавіць Галушку і Кіеню ў правах грамадзянства. Чым раней гэта будзе зроблена, тым лепш. Яны змогуць яшчэ прынесці немалую карысць калгасу.

Што яшчэ я бачыў дрэннага? На полі сеюць працаёмкую культуру—кармовую траву. Недалёка ад калгаса знаходзіцца так званае пілпаў ское балота, дзе можна з вялікім поспехам сеяць кармовыя травы. Я ўспамінаю, як у 1918 - 14 годзе мой бацька паседаў на гэтым балоце 200 квадратных метраў кармовай травы і сабраў небывалы ўраджай. Гэтыя 200 кв. метраў далі тры вазы вельмі добрага сена. Чаму нельга ачысціць мох гэтага балота і пасеяць там травы? Калгас атрымаў-бы ад гэтага значна больш сена, чым з усіх сваіх сенажацяў.

Слаба развіта ў калгасе пчаляніцтва. А пры належнай увазе да гэтай справы яно магло-б стаць магутнай крыніцай даходу. Ва ўмовах выпадку пчалярніцтва далоб значна большы эканамічны эфект, чым трусы, якімі калгас бясплодна займаецца ўжо трэці год.

Усебеларускі паход за асваенне мастацкай літаратуры

ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПАХОД КІРАЎНІКАМІ І ЛІТАРАТУРАЙ

Прапанова Аршанчыны аб арганізацыі ўсебеларускага паходу к[illegible]ваенне мастацкай літаратуры была аднадушна ўхвалена на пасяджэнні спецыяльна скліканым па гэтаму пытанню рэдакцыяй «Звязды». На пасяджэнні прынімалі ўдзел прадстаўнікі палітсектораў — Наркамзема, гаркома КПБ(б)Б, ЦСПСБ, ДзВБ, саюза пісьменнікаў, саюза працаўнікоў асветы, гарвыканкома, аддзела асветы і Белкалмасаюза.

Выступаўшыя таварышы падкрэслілі вялікае палітычнае і культурнае значэнне гэтай карыснай ініцыятывы. Для канкрэтнага кіраўніцтва паходам пастановлена арганізаваць пры рэдакцыі «Звязды» цэнтральны штаб. У раёнах аддзяленні штаба павінны быць арганізаваны пры райкомах партыі, а для зоны МТС — пры палітаддзелах. Раённыя штабы апорнай базай практычнага правядзення паходу ў сельсоветах павінны выбраць настаўнікі калектыў непоўных сярэдніх школ.

Выступаўшыя тт. Александровіч, Рубінштэйн, Бранштэйн, Грыцкевіч, Браўковіч, Поўла, Іткін, Кузнецова, Зерэмбоўскі намецілі рад канкрэтных мерапрыемстваў для практычнага ажыццяўлення задач, пастаўленых перад усебеларускім паходам.

ДзВБ абавязалася на працягу бліжэйшых двух-трох тыдняў выдаць «Мать» М. Горкага, «Поднятую целину» Шолахава і др., масавым выданнем па танным цане.

Калектыў крытыкаў пры праўленні саюза совецкіх пісьменнікаў абавязаўся распрацаваць падрабязныя метадычныя ўказанні для кіраўнікоў гурткоў па літмінімуму. Метадычныя ўказанні будуць выданы асобнай кніжкай.

Усе настаўныя і раённыя газеты павінны ўключыцца ў паход і арганізаваць сістэматычнае асвятленне работы гурткоў у газетах. Адначасова газеты павінны сістэматычна друкаваць рэцэнзіі на кнігі па літаратурнаму мінімуму.

Прафсаюзы і камсамол павінны неадкладна арганізаваць збор літаратуры для пасылкі ў калгасы. На дапамогу гурткам павінны таксама пошці ўсе гарадскія і заводскія бібліятэкі, вылучыўшы для гэтай мэты патрэбную літаратуру.

АДКАЗ СПРАВАЙ

БАРЫСАЎ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

Па ініцыятыве рабочых прадпрыемстваў гарода камбіната «Комінтэрн», які шефствуе над Хайхоянскім сельсоветам, пленум сельсовета з удзелам настаўніцтва, вожатымоў і ўсяго актыву абгаварыў алоўкі Аршанскага раёна аб усебеларускім паходзе па асваенню твораў совецкіх пісьменнікаў.

Пленум пастанавіў ва ўсіх дзевяці калгасах сельсовета арганізаваць масавыя гурткі па чытанню мастацкай літаратуры па мінімуму, прапанаванаму Аршанчынай. Вылучаны адказныя за арганізацыю і правядзенне чытак. У калгасе імя Кагановіча чыткі праводзіць выкладчыца літаратуры плоўнай сярэдняй школы тав. О. Пушкіна, у калгасе «Перадавік» настаўнік Невалка, у калгасе «Чырвоная рагатка» гэту работу праводзяць два настаўнікі (калгас мае 100 гаспадарак). Усе настаўнікі абавязаліся прысвячаць чытанню мастацкіх твораў з калгаснікамі 15 гадзін у дзнаку. Непасрэднае чытанне літаратуры будуць праводзіць найбольш адукаваныя вучні 7-га класа.

Шэфы з камбіната «Комінтэрн» абавязаліся прысылаць брыгаду для дапамогі сельсовету ў гэтай рабоце, а таксама даць неабходную мастацкую літаратуру.

Узнята пытанне аб набыцці мастацкай літаратуры ўсімі калгасамі сельсовета.

Першыя чыткі былі праведзены 30 кастрычніка.

П. ЧЫКУН.

МАЗЫРСКІ РАЙКОМ УКЛЮЧЫЎСЯ У ПАХОД

МАЗЫР. (Па тэлеграфу).

Райком КП(б)Б вітае кіраўнікоў і актыў Аршанскага раёна — ініцыятараў арганізацыі ўсебеларускага паходу за асваенне мастацкай літаратуры.

Уключаючыся ў паход, распрацоўваем канкрэтныя мерапрыемствы па забеспячэнню практычнага яго правядзення.

Сакратар РК КП(б)Б ШЫМКОВІЧ.

ЦЭНТРАЛЬНЫ ШТАБ КІРАЎНІЦТВА ПАХОДАМ

Цэнтральны штаб кіраўніцтва паходам за асваенне мастацкай літаратуры створан у складзе тт. Лендзнера («Звязда»), Пелікана (палітсектар), Бабчынскага (ЦК ЛКСМБ), Браўковіча (ДзВБ), Рубінштэйна (ЦСПСБ), Александровіча (саюз совецкіх пісьменнікаў), Грыцкевіча (ЦК саюза прац асветы).

З апошняй пошты

„ШУМУ МНОГА — СПРАВЫ МАЛА"

Перагрукоўваючы агляд друку, змешчаны ў «Звяздзе», рэдакцыя бялынкіцкай раённай газеты «Чырвоны калектывіст» поўнасцю згаджаецца з ацэнкай работы газеты і прыняе памылкі, указаныя ў агляде.

«Ужо той факт,—пішацца ў рэдакцыйнай заўвазе,—што наш раён, з'яўляючыся ільнавотчым, займае адно з апошніх месц па ільнозахтоўках сярод ільнаводчых раёнаў і знаходзіцца на чорнай дошцы, сведчыць аб дрэнным рабоце нашай газеты. Наша газета не дала прыкладнага паказу запрацоўкі ільну ў калгасах, не выкрыла сапраўдных прычын гаспадарчага адставання раёна ў ільна заготоўках, не выкрыла таго, што рад калгасаў ігнаруюць дырэктыву партыі і ўрада аб выдачы хлеба за апрацоўку ільну, што скрыўлена лінія партыі аб налічэнні працадзён.

Гэтыя памылкі газета «Чырвоны калектывіст» павінна і абавязаецца неадкладна выправіць».

Чэрвеньскія бюракраты ігнаруюць пісьмы працоўных

Сёння мы змяшчаем рэдакцыйны артыкул аб злачынных адносін чэрвеньскіх раённых партыйных і совецкіх арганізацый да пісем і скарг працоўных. «Звязда» падкрэслівае, што Чэрвень з'яўляецца адным з яркіх узораў бюракратычных адносін да сігналаў мас.

Урок Чэрвеня павінны ўлічыць усе парторганізацыі з тым, каб не дапускаць гэтых скажэнняў на месцах.

«Звязда» просіць камісію партыйнага кантролю заняцца гэтай справай і вынесці адпаведнае рашэнне.

Артыкулам аб Чэрвені «Звязда» пачынае асвятленне становішча работы з пісьмамі працоўных у раённых і цэнтральных арганізацыях, бязлітасна выкрываючы, не гледзячы на асобы, бюракратаў, сабатуючых партыйныя рашэнні аб чулых адносінах да пісем працоўных.

«Звязда» штодзённа атрымлівае больш сотні пісем з розных канцоў БССР, у якіх працоўныя звяртаюцца з розным прапановамі, ускрываюць недахопы, выкрываюць злачынныя дзеянні пралезлых класавых ворагаў у калгасы, у совецкія ўстановы і т. д. Такі аграмадны штодзённы прыток пісем, зусім зразумела, нельга поўнасцю змясціць на старонках газеты і значная частка з іх пасылаецца ў мясцовыя партыйныя, совецкія, профсаюзныя арганізацыі для рэагавання і прыняцця канкрэтных мер на месцы.

Здавалася-б, што на мясцах павінны былі адносіцца да гэтых матэрыялаў вельмі чула, хутка на іх рэагаваць, падымаць кожны факт на прынцыповую вышыню.

Аднак, у некаторых раёнах частка пісем працоўных попадае ў лапы чыноўнікаў, бюракратаў, засеўшых у нашы апараты. Зарваўшыяся вяльможы не лічаць патрэбным не толькі рэагаваць на пісьмы, але нават і адказваць на іх.

Да такіх «гробакапацеляў» ініцыятывы працоўных — што ў канчатковым выніку з'яўляецца не чым іншым, як грубым зажымам самакрытыкі — адносяцца чэрвеньскія раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі. За 7-8 месяцаў у чэрвеньскім райкоме, райвыканкоме ўхітрыліся замарынаваць звыш 20 карэспандэнцый «Звязды» і звыш 50 пісем працоўных, пасланых на расследаванне мясцовай газетай «Калектывіст».

Больш таго. **У райземаддзеле, пры наяўнасці каля 40 работнікаў, згубілі 36 заметак. Райком партыі не адказаў «Звязде» на 11 заметак, райпракуратура — на 7** і т. д. Можа гэтыя пісьмы не заслугоўвалі ўвагі — узнікае законнае пытанне. Можа яны не прадстаўлялі цэннасці і не дапамагалі ў рабоце мясцовым арганізацыям? Аказваецца, якраз наадварот. Уся сутнасць справы ў тым, што менна «гублялісь» тыя пісьмы, якія прадстаўлялі выключна вялікае значэнне, падымалі рад прынцыповых пытанняў. Паток пісем з Чэрвеньскага раёна галоўным чынам **датычыў засмечанасці калгасаў класава-чужымі элементамі.** У пісьмах выкрываліся факты шкодніцкай дзейнасці пралезлых у калгасы і ў раённыя ўстановы класава-чужых элементаў. У пісьмах падымаўся рад пытанняў, звязаны разам з зажымам самакрытыкі з нячулымі адносінамі да патрабаванняў мас.

Абагульваючы ўвесь комплекс пытанняў, падымаемых сельскорэмі ў пісьмах, мы якраз і падыходзім к **выводу, што з-за нячулых, небольшэвіцкіх адносін да сігналаў мас, з-за прытуплення рэволюцыйнай пільнасці ў кіраўніцкай раёна** (старшыня РВК **Бушман**, нам. сакратара РК **Лебедзь**) **Чэрвень цягнецца ў хвосце па ўсіх без выключэння гаспадарча-палітычных кампаніях.**

Звернемся да фактаў. 24 красавіка «Звязда» пераслала райкому партыі пісьмо для рэагавання. У гэтым пісьме селькоры пісалі, што ў калгасе «Комінтэрн» група кулакоў і антысовецкіх элементаў на чале з дэзертырам Чырвонай арміі — цяперашнім старшынёй калгаса Ласкаўцом Ерэмам займаецца шкодніцтвам і вядзе калгас да развалу. Напрыклад, кулачо збівала жарэбных кабыліц і з пяці жарэбных — 4 абартавала. З-за раскрадвання кармоў здыхалі коні. У хліве-ж згнаілі звыш 200 пудоў сена. 17 гектараў жыта і 4 гектары азімай пшаніцы асталіся няўбранымі. План азімай сяўбы ў мінулым годзе недавыканалі на 40 гектараў. У гэтым годзе пасеялі гарох у аднавор. 1.300 рублёў крэдыта для камплектавання свінога пагалоўя старшыня калгаса разбазарыў на іншыя мэты. Згнаілі лён і т. д. і т. д. У пісьме прыводзіліся абураючыя факты адкрытага шкодніцтва ў калгасе. Здавалася-б, што, атрымаўшы такое пісьмо, райком неадкладна зойдзецца яго праверкай і аздаровіць калгас. Але не тут-то было. У Чэрвені «вяльможы» нават і не прачыталі яго як належыць і паклалі пад сукно.

Рабселькоры прадаўжалі засыпаць раённыя арганізацыі і газеты пісьмамі і патрабавалі спыніць кулацкую дзейнасць. Справа перахоўніць у міліцыю, але там, аказалася таксама кулакі і справу змазалі. Толькі пасля выезду пракуратуры справа прыняла другі абарот. Выяўлена контррэволюцыйная групоўка, якая вяла лінію на развал калгаса.

Райком правяў выключна бяздушныя адносіны, а міліцыя проста пакрывала кулацкія справы. Характэрна, што нават і пасля выкрыцця справы ў калгасе «Комінтэрн» райком не палічыў патрэбным надаць гэта пытанне на прынцыповую вышыню, не асудзіў сваіх памылак, не мабілізаваў селькоўскую армію на барацьбу з кулаком і яго агентурай.

Другі прыклад выключна бяздушных адносін да патрэбнасцей мас. Каля месяца як «Звязда» паслала райпрофсавету пісьмо сплаўшчыкаў, у якім яны скардзіліся, што ім не выплачваюць заработную плату. І да гэтага часу ніякага адказу, ніякага рэагавання.

Або 29 жніўня ў райком партыі пераслана пісьмо, у якім паведамлялася, што ў калгасе «Спартак» знайшлі сабе прытулак усе кулацкія і антысовецкія элементы вакольных вёсак. І гэта кулачо ўзяло лінію на знішчэнне конскага пагалоўя. «Звязда» **два разы пасылала** напамінанні, але і да гэтага часу няма ніякага адказу. А такіх пісем, такіх напамінанняў за чэрвеньскімі арганізацыямі лічыцца каля ста штук. Нават і тыя пісьмы, якія былі апублікаваны ў «Звязде» і адрасаваны на імя старшыні РВК т. Бушмана, таксама асталіся без адказу. Напрыклад, пісьмо «Кулацкае засіле ў Палячэўскім сельсавеце», і іншыя, асталося без результатаў. Такога роду бюракратычныя адносіны да пісем працоўных пагубна адбіваюцца на развіцці рабселькораўскага руху, на разгортванні крытыкі і самакрытыкі. Прамым абгінаванням райкому партыі, райвыканкому і іншым раённым арганізацыям у іх бюракратычных адносінах да патрэб мас гучэлі словы рабселькораў на раённым злёце.

Лепшы ўдарнік-селькор з калгаса «Раванічы» т. **Казёл Уладзімір** кажа:

— Мала пішуць калгаснікі ў насценгазету, баяцца пісаць, на заметкі не рэагуюць.

Рукі не падымаюцца пісаць, калі бачыш, як у раённай міліцыі пакрываюць кулакоў і сядзейнічаюць зажыму самакрытыкі.

Або селькор Няборскі з калгаса «Чырвоны Гарадок» гаварыў:

— Вясною рэгулярна выходзіла насценгазета, а зараз яна не выходзіць. Прычынай — зажым самакрытыкі, ганенне на селькораў.

Усе спрэчкі на раённым злёце ішлі пад знакам таго, што ў раёне і на месцах ніхто не рэагуе на пісьмы селькораў.

І што-ж зрабіла раённае кіраўніцтва пасля злёта, пасля агляду чэрвеньскай газеты «Звязды», у якім яна таксама ўскрывала факты адсутнасці рэагавання на пісьмы працоўных — роўным лікам нічога.

Раённае партыйнае і совецкае кіраўніцтва звяжалася з гэтым становішчам і не лічыць патрэбным рэагаваць на сігналы працоўных.

Кіраўнікі не разумеюць, або не хочуць разумець таго, што сваімі антыпартыйнымі адносінамі да пісем працоўных яны льюць ваду на млын класавага ворага. Не можна цярпець далей такога становішча. Ставіцца пытанне ці намераны кіраўнікі чэрвеньскіх партыйных і совецкіх арганізацый ажыццяўляць пастановы 17 з'езда і пленума камісіі партыйнага кантролю.

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

САКРАТАРУ ГОМЕЛЬСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б тав. ШАФАРЭНКА.

ЗА САМАКРЫТЫКУ ЗНІМАЮЦЬ З РАБОТЫ

(ПІСЬМО РАБОЧАГА)

У маі бягучага года група рабочых кацельшчыкаў гомельскага завода «Пролетарый» была перакінута на будаўніцтва Нова-Белічскага жыркамбіната. Кіраўніком групы быў прызначан былы дырэктар кацельнага цэха завода тав. Гарэлік.

Кіраваў Гарэлік работай дрэнна. Работа не клеілася. Насценная газета змясціла аб гэтым заметку. Гарэлік абурыўся. Пасля гэтага рэдактар насценнай газеты тав. Беладзедаў узводзіцца ў прагульшчыкі і знімаецца з работы.

Такая расправа за самакрытыку з тав. Беладзедавым абурыла рабочых і разам з тым з'явілася прычынай таго, што рабочыя крытыкаваць дзеянні і дрэнную работу свайго кіраўніка больш не асмельваліся.

А работа на камбінаце не паляпшаецца, а з месяца ў месяц пагаршаецца. У рабоце вялікі процант браку, план не выконваецца. Усё гэта зрывае своечасовы пуск камбіната.

ТЭКЛІН.

СТАРШЫНІ ГЛУСКАГА РВК тав. ШЛЯХТУНОВУ

ТРЫ ГАДЫ ПРАВОДЗЯЦЬ ТЭЛЕФОН

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА)

Самы далёкі сельсавет Глускага раёна—Гацкі. Ён знаходзіцца ад раённага цэнтра на адлегласці 40 кілометраў. У 1933 годзе райаддзел сувязі пачаў праводзіць тэлефон.

Загатовілі слупы, падрыхтавалі ямы для іх і значную колькасць слупоў паставілі. На гэтым і спынілі работу.

Слупы ўжо пагнілі, ямы пазасыпаліся. Вось як будуюць у Гацкім сельсавеце тэлефонную сувязь.

ЛЕШЧАНКА Я. А.

СТАРШЫНІ ЗАСЛАЎСКАГА РВК тав. АРОНІНУ

ЯК ДОЎГА БУДЗЕ БУДАВАЦЦА ДОМ СОЦКУЛЬТУРЫ?

(ПІСЬМО НАСТАЎНІКА)

Яшчэ ў 1932 годзе ў Шапялеўскім сельсавеце (Заслаўскі раён) пачата будаўніцтва дома соцкультуры. Падведзен фундамент, на палову выведзены сцены, падрыхтаваны амаль усе будаўнічыя матэрыялы. На ўсё гэта затрачана звыш 6 тысяч руб.

Але невядома, па якой прычыне ў гэтым-жа годзе работа спынілася. І вось ужо па працягу больш двух год гніюць выведзеныя сцены, расцягваецца будаўнічы матэрыял. Тым часам у сельсавеце не праводзіцца ніякай культурна-масавай работы. Ды і праводзіць яе няма дзе, бо ў сельсавеце толькі ў адным калгасе ёсць невялічкі чырвоны куток.

Гэта бачыць сельсавет, бачаць і раённыя арганізацыі, але ніякіх мер для скавчэння будаўніцтва дома ніхто не прымае.

БРЭГЕР.

Я адмоўцца старшыня калгаса Шічукаў да насценгазеты

Старшына калгаса «Рухавік» Острашскага сельсавета (Случчына) Шічукаў запісае самакрытыку ў насценгазеце (З пісьма ў «Звязду»).

УПАЎНАВАЖАНАМУ НАРКАМАТА СУВЯЗІ ПА БССР тав. ВАЛОДЗЬКУ

КАЛІ Я АТРЫМАЮ ГРОШЫ?

(ПІСЬМО СТУДЭНТА)

Мой бацька 10 мая бягучага года ў паштовым аддзяленні Халамер'е, Гарадоцкага раёна на маё імя здаў грашовы пераклад на суму ў 30 руб. Грошы пасылаліся ў Менск.

Ужо лістапад месяц, а грошы так і не атрымаў. Я ў Менску, а мой бацька ў Халамер'і некалькі раз скарджыўся і патрабаваў вярнуць грошы.

Паштовыя чыноўнікі халамерскага аддзялення раяць звярнуцца ў Менск, а ў Менску наадварот — у Халамер'е.

Пяўжо я так і не атрымаю высланых мне грошай.

Студэнт Менскага медінстытута. ЦІХАНАЎ Х.

НАМ ПІШУЦЬ

Вартаўнікам калгаса імя Будзёнага (Уваравіцкі раён) выдалі стрэльбы.

Але, як піша калгаснік Мешчанінаў, пораху не далі ні грама. Зварачаліся не раз у міліцыю, у горміліцыю і томельскае аддзяленне «Дынамо», але без выніку. А ваўкі тым часам кожную ноч давяць калгасную жывёлу. Нядаўна задавілі двух 3-хгадавых коней і 3 свіней.

Па слядах пісем

„ЧАМУ МНЕ НЕ ВЫПЛАЧВАЮЦЬ ПЕНСІЮ"

На змешчанае ў «Звязде» пісьмо трактарыста «Чаму мне не выплачваюць пенсію» палітаддзел Клімавіцкай МТС паведамляе:

За бяздушныя адносіны да скаргаў рабочых справа аб былым старшыні рабкома (зараз старшыня сельсавета) Захарэнка перадана на бюро райкома.

Новаму складу рабкома прапанавана вырашыць пытанне аб выдачы Баранаву пенсіі па інвалідасці.

ПА СЛЯДАХ НЕАПУБЛІКАВАНЫХ ПІСЕМ

Калгаснік Запуб пісаў, што ў калгасе імя Варашылава (Смалявіцкі раён) ад дрэннага догляду захварэла 29 цялят.

Смалявіцкі райземаддзел паведамляе, што факты пацвердзіліся. Дагледчыца цялят Камінская аддана пад суд. Загатчык фермы Рыжык і старшыня калгаса Хмяльніцкі з працы зняты. Участковаму тэхніку жывёлаводу. Лейкінай абвешчана вымова.

***

Калгаснік Касцян Іван (з Клічаўскага раёна) пісаў у «Звязду» аб пакражы калгаснага жыта Касцянам Юркам.

Клічаўскі райпракурор паведаміў, што паказаныя факты поўнасцю пацвердзіліся пры расследванні. Касцян Юрка аддан пад суд па 241 арт. крымінальнага кодэкса.

***

Селькор Ш. А. з Брагінскага раёна паведаміў, што ў калгасе «Чырвоны Окцябр» рахуникаводам працуе былы гетманскі служака, п'яніца Крысенка Андрэй Фёдаравіч, які ўвесь час падрываў працоўную дысцыпліну і разбазарваў калгаснае дабро.

Брагінскі райвыканком паведамляе, што факты поўнасцю пацвердзіліся. Пастановай прэзідыума РВК Крысенка Андрэй з работы знят і аддан пад суд.

***

Селькор з Буда-Кашалёўскага раёна пісаў, што загадчык раённа Назарава прызначыла загадчыкам сямігадовай школы аферыста і злодзея Баброва, які прысвоіў школьныя грошы і ўрабіў рад злачынстваў.

Буда-Кашалёўскі райпракурор паведамляе, што факты пацвердзіліся. Назарава з работы знята, а Баброў аддан пад суд.

Калгаснік калгаса «Чырвоны бор», Валасевіцкага сельсавета, паведаміў у рэдакцыю, што старшыня калгаса Лабач п'янствуе і раскрадвае памольны збор.

Пракурор Нарыцкага раёна паведамляе, што факты пацвердзіліся. Вінаваты Лабач прыцягваецца да будовай адказнасці.

***

Селькор калгаса «Чырвоны Цяпкоў» паведаміў у рэдакцыю, што загадчык калгаснага склада Палусь Мікалай выдаў калгаснікам недобранакасную пшаніцу.

Пракурор Нараўлянскага раёна паведамляе, што факты пацвердзіліся. Кладаўшчык М. Палусь аддан пад суд.

ЗАКУПКІ ХЛЕБА

ХУТЧЭЙ ПРАСОУВАЦЬ ТАВАРЫ ПРАДАУЦУ ХЛЕБА

СПРАВУ РАШАЮЦЬ ЖЫВЫЯ ЛЮДЗІ

Шостая пяцідзённка кастрычніка дала нязначны рух у разгортванні закупак хлеба. Калі за пятую пяцідзённку прырост дасягаў нямногім больш паўтара процанта, то за гэту пяцідзённку ён дасягае 6,9 проц.

На прыкладзе гэтай пяцідзённкі відаць, як ва многіх раёнах не ўмеюць арганізаваць справу. Варта было толькі пасланым ЦК упаўнаважаным узяцца за справу закупак хлеба як процант прыросту закупленага хлеба значна ўзняўся.

Аршанскі раён у мінулую пяцідзённку закупіў 23 тоны, а ў гэту —81. Брагінскі раён за пятую пяцідзённку закупіў 45 тон, за шостую—137 тон.

Адначасова з тымі раёнамі, якія паказалі больш-менш узорныя прыклады работы, ёсць і такія раёны, як Бярэзінскі, Глускі, Дрысвяцкі, Петрыкоўскі. Рэчыцкі, які пакат і ў гэтай пяцідзённцы, не гледзячы на велізарную дапамогу, аказаную ім з боку цэнтральных арганізацый, знізілі тэмпы закупак хлеба.

„КААПЕРАТАРЫ" З ЧАВУС

Калгаснікі Чавускага, як і іншых раёнаў, прадавалі дзяржаве хлеб з тым, каб атрымаць ад сельпо патрэбныя тавары. Калгасы, прадаючы хлеб, улічвалі, каб кожны калгаснік атрымаў тое, у чым ён мае патрэбу. Але... калгаснікі Доўгамохскага сельсавета нічога не могуць атрымаць за праданы хлеб.

Райспажыўсаюз зусім не даў таварў у крамы сельпо за выключэннем Усужскай. Райсаюз тлумачыць гэта тым, што ён дазволіў закупляць збожжа толькі цэнтральнай краме сельпо. Як запэўняюць кіраўнікі райспажыўсаюза, у гэтай-жа цэнтральнай краме і павінны быць усе тавары.

Ад Доўгамохскага сельсавета да цэнтральнай (Усужскай) крамы—15 клм., і таму калгаснікі не могуць туды хадзіць часта за патрэбнымі рэчамі. Але і ў гэтай краме няма патрэбных тавараў.

Райспажыўсаюз забараніў закупляць хлеб астатнім крамам сельпо. Гэта прывотзіць да таго, што калгаснікі і аднаасобнікі, якія прыносяць свой хлеб у іншыя крамы гэтага сельсавета, вымушаны вяртацца назад, бо там тавараў хлебнага фонда няма, і калгаснік не мае чаго купіць.

Сваімі распараджэннямі Чавускі райспажыўсаюз фактычна тармозіць закупку хлеба ў калгасах, калгаснікаў і аднаасобнікаў. Не можа быць такога становішча, каб калгаснік або аднаасобнік вымушан быў хадзіць за некалькі кілометраў для таго, каб прадаць хлеб, у той час, як ён мае краму зусім блізка.

ДОБРАМЫСЛАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ: **Дзеянні кіраўнікоў чавускага райспажыўсаюза накіраваны на зрыў дзяржаўных закупак хлеба. Райспажыўсаюз не пакланяўся аб тым, каб завезці ва ўсе крамы тавары хлебнага фонда. Калгаснікі і аднаасобнікі доўгі час не могуць атрымаць за праданае імі збожжа неабходных тавараў. Рэдакцыя чакае, што райком партыі і Белкаапсаюз прымуць рашучыя меры і выправяць дапушчаныя чавускім райспажыўсаюзам памылкі.**

НЕ ТОЙ ДАРОГАЙ

Чачэрскі раён калектыўзаван толькі на 48 проц. Між тым сярод аднаасобнікаў закуплена толькі 18 тон хлеба. Усяго ў раёне закуплена 282 тоны, вывезена на склад Заготзярно 132 тоны.

Адставанне Чачэрскага раёна тлумачыцца ў першую чаргу бяздзейнасцю старшыні райспажыўсаюза і загадчыка райканторы Заготзярно. Калі спытацца ў члена праўлення райсаюза тав. Маркава, у чым прычыны адставання раёна, ён абавязкова адкажа: «У нашым раёне лішкаў хлеба няма».

Загадчык Заготзярно тав. Шырмач (да рэчы, член партыі) тлумачыць зрыў закупак так: «У мяне малы апарат і я не магу забяспечыць закупку хлеба.

Гэтыя, па сутнасці, антыдзяржаўныя настроі не атрымліваюць належнага адпору з боку кіраўніцкай раёна.

Безумоўна, закупкі нельга арганізаваць метадамі намесніка старшыні РВК тав. Плашчова. Тав. Плашчоў прыехаў у Дуадзіцкі сельсавет ноччу, сабраў сельскі актыў і арганізаваў падпорны абход. Усю ноч хадзілі па хатах, будзілі сялян, каб аддзячнія насілі хлеб у каапераацыю.

І ў гэту ноч—29 кастрычніка—было закуплена (вярней сабрана) 2.914 кіло.

У час прыёмкі квіткоў не выдавалі. Складаўся агульны ліст.

МАНУСЕВІЧ.

ПЕРАДАВІЧІ ХЛЕБАЗАКУПАК

Барысаўскі раён
Віцебскі
Гомельскі
Дзержынскі
Касцюковіцкі
Клімавіцкі
Лоеўскі
Менскі
Хойніцкі
Чэрыкаўскі

РАЁНЫ, ЯКІЯ ЗРЫВАЮЦЬ ХЛЕБАЗАКУПКІ

Бабруйскі раён (сакратар РК **Міллер**, старшыня РВК **Мінчонак**, старшыня райспажыўсаюза **Старавойтаў**).

Буда-Кашалёўскі (сакратар РК **Пеўзнер**, старшыня РВК **Буцько**, старшыня РСС **Турко**).

Дубровенскі (сакратар РК **Мышалаў**, старшыня РВК **Мацько**, старшыня РСС **Захарэнка**).

Камарынскі (сакратар РК **Трызна**, старшыня РВК **Гузаў**, старшыня РСС **Спмашка**).

Плешчаніцкі (сакратар РК **Паромчык**, старшыня РВК **Лясовіч**, старшыня РСС **Лук'яновіч**).

Стародарожскі (сакратар РК **Шлапёнак**, старшыня РВК **Асташонак**, старшыня РСС **Вербін**).

Чэрвеньскі (нам. сакратар РК **Лебедзь**, старшыня РВК **Бушман**, старшыня РСС **Малый**).

ФРАНКА-СОВЕЦКАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА У БАРАЦЬБЕ ЗА МІР

Скарочаная гутарка спецыяльнага карэспандэнта „Правды" з Эдуардам Эрыо

ПАРЫЖ, 1 лістапада. (Па тэлефону). Учора спецыяльны карэспандэнт «Правды» быў прыняты міністрам Эрыо.

У гутарцы, якая праваўжалася каля гадзіны, Эрыо падрабязна спыніўся на развіцці франка-совецкіх адносін у сувязі са споўніўшымся на-днях 10-годдзем аднаўлення адносін паміж СССР і Францыяй.

«У тэлеграме, якую я адправіў народнаму камісару па замежных справах Літвінаву з прычыны дзесяцігоддзя аднаўлення адносін паміж Францыяй і СССР, — заявіў Эрыо, — я выказаў глыбокія пачуцці радасці і задавальнення, адчуваемыя мною ў сувязі з гэтай знаменальнай гістарычнай датай.

Я з найвялікшым давер'ем гляджу на будучае франка-совецкіх адносін, бо пераконан, што з абодвух бакоў будуць і ў далейшым праяўляцца такая-ж добрая воля і такое-ж разуменне ўзаемных інтарэсаў, як і да гэтага часу.

Вы пытаеце, што, на маю думку, практычна трэба зрабіць для далейшага развіцця і паглыблення адносін паміж нашымі краінамі?

Я думаю, што перш за ўсё трэба ўзмацніць і ўчасціць асабісты кантакт паміж дзеячамі абодвух краін. Затым неабходна ўпарадкаваць нашы эканамічныя адносіны, каб яны ў далейшым не адставалі ад нашага палітычнага, навуковага і інтэлектуальнага супрацоўніцтва.

Што датычыць мяне, то нішто не вможа звесці мяне са шляху развіцця і паглыблення франка-совецкіх адносін. Я глыбока ўсведамляю тую карысць, якую прынесла і прыносіць народам абодвух краін і справе захавання міру ў Еўропе франка-совецкае збліжэнне.

Што датычыць французскага народа, то магу сказаць, што ён ні пры якіх міжнародных ускладненнях, якія могуць узнікнуць, не страціць свайго самаўладання і хладнакроўя, бо ён пранікнут адным імкненнем — забяспечыць сваю спакойную, мірную працу.

Я ведаю, што і народы СССР пражыкнуты тым-жа імкненнем, што яны горды сваімі вялікімі дасягненнямі і гатовы іх абараняць. Гэта агульнасць інтарэсаў народаў абодвух краін, іх шчырае імкненне да паляпшэння існуючай дружбы напаўняюць мяне глыбокай радасцю. Я пераконан, што народы Францыі і СССР здольны выратаваць свет ад варварства новай вайны, якая ўдарыць перш за ўсё па інтарэсах шырокіх працоўных мас. І я паўтараю — франка-совецкае збліжэнне грунтуецца на цвёрдай і моцнай аснове. Народы абодвух краін аб'ядноўваюць свае намаганні для дасягнення мэты, якую яны перад сабой паставілі. Ажыццяўленне агульных задач павінна і ў далейшым базавацца на строгім неўмяшанні ва ўнутраныя справы. Зарукаю моцнасці і пладатворнасці франка-совецкага збліжэння з'яўляецца развіццё нашага супрацоўніцтва на міжнародным арэне».

У заключнай частцы гутаркі з вашым карэспандэнтам былі пастаўлены некаторыя пытанні, звязаныя са становішчам ва Усходняй Еўропе. Эрыо падкрэсліў непарушнасць сувязей Францыі з Малой Антантай. Ён, між іншым, сказаў:

«Францыя заўсёды астанецца вернай саюзным з ёй дзяржавам Малой Антанты, і яна ведае, што таксама можа разлічваць на вернасць ёй гэтых дзяржаў».

Эрыо закончыў сваю гутарку наступным зваротам да чытачоў «Праўды»:

«Хутка краіна Совецтаў будзе святкаваць XVII гадавіну Окцябрскай рэволюцыі.

Я віншую чытачоў «Правды» і ўсе народы Совецкага Саюза з гэтым святам.

Я жадаю працоўным масам вашай вялікай краіны ўсякіх поспехаў і працвітання.

Я пераконан, што 1 ў наступаючым 18 годзе Окцябрскай рэволюцыі яны таксама мужна і няўхільна будуць абараняць справу міру, як абаранялі не да гэтага часу».

ГОФМАН.

БАРАЦЬБА ЗА СОВЕЦКУЮ УЛАДУ — ЛОЗУНГ СУСВЕТНАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА

Тав. ДЗЮКЛО АБ ЗНАЧЭННІ ОКЦЯБРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

ПАРЫЖ, 1 лістапада. (БЕЛТА). Парыжскі абласны і гарадскі камітэты кампартыі Францыі арганізавалі вечар, прысвечаны 17 гадавіне Окцябрскай рэволюцыі. На вечары прысутнічала 5 тысяч рабочых.

Сакратар французскай кампартыі т. Дзюкло выступіў з прамовай, у якой спыніўся на гістарычным значэнні Окцябрскай рэволюцыі і падрэсліў поспехі сацыялістычнага будаўніцтва ў Совецкім Саюзе. Спасылаючыся на масавыя выступленні рабочых у розных капіталістычных краінах, і ў прыватнасці на паўстанне рабочых у Іспаніі, т. Дзюкло заявіў, што барацьба за совецкую ўладу ўсё больш і больш становіцца лозунгам сусветнага пролетарыята.

Характарызуючы палітычнае становішча ва Францыі, т. Дзюкло ўказаў на рост фашысцкай небяспекі і заклікаў к аб'яднанню адзінага фронта рэволюцыйнай барацьбы і к стварэнню прафсаюзнага адзінства, узмацненню барацьбы за вызваленне т. Тэльмана і ўсіх іншых зняволеных барацьбітоў супроць фашызма. Прамова т. Дзюкло была пакрыта бурнымі апладысментамі.

ФРАНЦУЗСКІ ДРУК АБ ПАЛІТЫЦЫ ГЕРМАНІІ

ПАРЫЖ, 1 лістапада. (БЕЛТА). Паводле паведамлення раду газет Гітлер намеран у бліжэйшы час прапанаваць Францыі эканамічнае пагадненне, мэтай якога з'явіцца снабжэнне Германіі сыравінай. Учарашняя прамова Шахта павінна была паслужыць пробным шагам у гэтым напрамку. Гэты новы германскі манеўр спаткан розка адмоўна французскім друкам.

«Одр» піша, што не ў інтарэсах Францыі пастаўляць Германіі сыравіну для гармат і снарадаў, якія будуць накіраваны рана ці позна супроць французскай армії.

«Журналь дэ Дэба» называе апошнюю прамову Шахта «спляценнем хлусні» і «манументам нядобрасумленнасці». «Прадаўжаючы ўзбройвацца з крайняй паспешнасцю, —піша газета, — Германія ўжо ўвяла ў сябе эканамічную сістэму ваеннага часу. Каб насельніцтва магло ле пераносіць, яго нацкоўваюць на замежныя дзяржавы. Адніак, вельмі пажадана атрымаць адначасова салдэйнасць гэтых-жа самых дзяржаў, тым больш, што яны дазволілі сябе ашукваць на працягу 10 год. Вось што значыць веймарская прамова Шахта».

УВЯДЗЕННЕ НАФТАВАЙ МАНАПОЛІІ У МАНЧЖУРЫІ

ТОКІО, 1 лістапада. (БЕЛТА). Манчжурскі ўрад 30 кастрычніка аб'явіў аб ўвядзенні нафтавай манаполіі. Манаполію будзе ажыццяўляць «Манчжоу-Го ойл компані» з капіталам у 5 млн. іен. З іх 1 млн. належыць манчжурскаму ўраду, 2 млн. Паўднёва-Манчжурскай чыгуначнай паароўну паміж канцэрнамі Міцуі і Міцубісі, нафтавымі кампаніямі «Ніхон Секію» (цесна звязана з канцэрнам Міцуі) і «Кокура ойл». Главой «Манчжоу-Го ойл компані» з'яўляецца глава «Ніхон Секію»—Хасімота. Прадстаўнікі замежных нафтавых фірм указваюць, што пры спробе набыць акцыі «Манчжоу-Го ойл компані» яны былі павеламлены, што гэтыя спробы асуджаны на правал.

САКРЭТНЫЯ І ВЕТРАНЫЯ УЗБРАЕННІ ГЕРМАНІІ

ПАРЫЖ, 1 лістапада. (БЕЛТА). «Піці журналь» друкуе новыя выкрыцці аб сакрэтных паветраных узбраеннях Германіі. Згодна вестак газеты, усе камерцыйныя самалёты фірмы «Люфт—Ганза» могуць быць на працягу дня перароблены ў бамбардзіровачныя або разведчыя самалёты. Германія ўжо мае магутны паветраны флот у 2.400 самалётаў, абсталяваных па апошняму слову тэхнікі і маючых вялікую хуткасць.

УЗДЫМ ПАЎСТАНЦКАГА РУХУ У МАНЧЖУРЫІ

Х валя паўстанняў у войсках Манчжоў-Го

ШАНХАЙ, 31 кастрычніка. (БЕЛТА). Газета «Сіньвеньбао» паведамляе, што, згодна афіцыяльных японскіх статыстычных даных, агульны лік паўстанцаў у Манчжурыі дасягае **100 тысяч.** У апошні час кітайская прэса паведамляе аб **пачасціўшыхся выпадках паўстанняў у войсках Манчжоу-Го,** прычым паўстаўшыя далучаліся да паўстанцаў, якія аперуюць у Манчжурыі і ўнутравай Манголіі. Паводле слоў газеты «Чжулхуажыбао», у пачатку кастрычніка ў **Хуаньжэне, Туахуа і Куаньдзяне** (ва ўсходняй частцы Мукдэнскай правінцыі) **паўстала** звыш 2 тысяч манчжурскіх салдат, якія далучыліся да карэйскай «незалежнай армії».

Газета «Шуньбао» піша, што **полк манчжурскай кавалерыі** 26-га кастрычніка **паўстаў** каля Фушіна ў Гірынскай правінцыі. Японска-манчжурскія войскі,—піша газета, — праследуюць паўстаўшых і на тэрыторыі Суйбін у Гірынскай правінцыі **ідуць баі.**

Паводле слоў газеты «Сіньвеньбао», некалькі дзён таму назад у правінцыі **Жэхэ** ў раёне Міюня 60 салдат манчжурскага гарнізона паўсталі. Войскі праследуюць паўстаўшых. Паміж паўстанцамі і японцамі ідуць баі ва многіх частках Манчжурыі. Паводле слоў газеты «Муньбао», сур'ёзныя баі мелі месца ў Хуаньжэне (ва ўсходняй частцы Мукдэнскай правінцыі), прычым у баі прымалі ўдзел японская артылерыя і японскія аэрапланы. Паўстанцы, паводле слоў газеты, панеслі вялікія страты.

Агенцтва «Сімбун рэнго» паведамляе, што «бандыты» ў правінцыі Жэхэ захапілі старшыню раёна нага ўрада ў горадзе Цінлун, а таксама ўсіх яго японскіх і манчжурскіх падначаленых, у тым ліку двух японскіх дарадчыкаў і двух японскіх афіцэраў.

***

БЕЙПІН, 29 кастрычніка. (БЕЛТА). З Харбіна паведамляюць: «Харбін ніці-ніці» ад 27-га кастрычніка перадае, што 2-я рота цыцыкарскай армії ў Цыкфі 21 кастрычніка прабавала паўстаць. Змова была раскрыта і салдаты абязброены.

ГЕРОЙСКІ УЧЫНАК СІГНАЛІСТА КРАНКОВА

ВІЦЕБСК, 2 лістапада. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Уноч з 30 на 31 кастрычніка сігналіст блок-паста 425 кілометра віцебскага аддзялення Кранкоў Ілья Іванавіч, знаходзячыся на дзяжурстве, атрымаў паведамленне ад суседняў-калгаснікаў, што на яго кватэру напалі злачынцы, звязалі жонку і забралі рэчы. Тав. Кранкоў, атрымаўшы гэта паведамленне, не пакінуў пост і паведаміў аб здарыўшымся дзяжурнаму па станцыі. Толькі калі з'явілася замена, тав. Кранкоў пайшоў дадому. Там ён знашоў завязаную жонку і разграбленую кватэру.

Сваім учынкам тав. Кранкоў паказаў прыклад велізарнай свядомасці і дысцыпліны.

Тав. Кранкоў працуе на транспарце 12 год. Ён з'яўляецца лепшым ударнікам станцыі.

Загадам начальніка станцыі тав. Кранкоў прэміраван месячным акладам і цёплай вопраткай.

⊙ Рабселькоры соўтаса **Блонь** уносяць на пабудову агітзвяна 123 руб. і выклікаюць наследаваць іх прыкладу рабселькораў соўтасаў **Вялень, Сінча і Бабы.**

ЦІШУК А.

⊙ Селькоры насценгазеты **«За большэвіцкія тэмпы»** калгаса **«Чырвоная плошча»,** Целяшоўскага сельсовета, Уваравіцкага раёна, унеслі на пабудову агітзвяна 84 руб.

ШЫЛЯНКОЎ.

⊙ На пабудову агітзвяна імя III усебеларускага з'езда рабселькораў работнікі рэдакцыі і друкарні **«Калектывіст»** (Уваравічы) унеслі 63 руб.

Ш.

⊙ Бешанковіцкая раённая газета на 1 лістапада сабрала на пабудову агітзвяна 425 руб. Збор сродкаў прадаўжаецца.

Сродкі на пабудову агітзвяна трэба пералічваць у Беларускае аддзяленне Дзяржбанка на бягучы рахунак № 160/10006.

КРЫЧЭУСКІ ЦЭМЕНТНЫ ЗАВОД ВЫКАНАЎ КАСТРЫЧНІЦКУЮ ПРАГРАМУ

Крычэўскі цэментны завод перавыканаў промфінплан за кастрычнік, даўшы — 151,9 проц. плана. План адгрузкі выкананы на 146 проц. Таксама значна перавыкананы план па здабычы сыравіны (крэйда, гліна) і выпрацоўцы поўфабрыкатаў (шлям, клінкер). Завод выканаў кастрычніцкі план пагрузкі цэменту Метрабуду, адгрузіўшы 44 вагоны. Якасць цэменту адпавядае запраектаванай для завода.

ВІШНЕЎСКІ.

Менск у дні окцябрскіх свят

У Менску шырока разгорнута работа па мастацкаму афармленню горада да святкавання XVII гадавіны Окцябрскай рэволюцыі.

Плац Волі афарміляецца на тэму «Сацыялістычнае будаўніцтва за 17 год у СССР». На плошчы ўстанаўляецца шар — земная куля, дзе на адной шостай частцы будзе паказана сетка пабудаваных буйных фабрык і заводаў за 17 год. Над шарам будзе ўзнят чырвоны сцяг з лозунгам «СССР — бацькаўшчына працоўных усяго свету».

Дом гарадскога совета афарміляецца на тэму «Менскі раён на ўсесаюзнай чырвонай дошцы». У малюнках і дыярамах будзе паказана змычка горада з новай сацыялістычнай вёскай.

Цэнтральная частка Дома ўрада афарміляецца на тэму — перамогі совецтаў.

Да гэтай работы прыцягнуты 38 мастакоў і скульптараў, а таксама звыш ста членаў гурткоў выяўленчага мастацтва.

Спіс таварышоў, вылучаных ГК КП(б)Б дакладчыкамі на сходы, прысвечаныя XVII гадавіне Окцябрскай рэволюцыі

Завод імя Варашылава—Валковіч, Каменеў, Рыскін, завод «Комунар»—Чарвякоў, Пассэ, Шулькін, завод «Ударнік»—Галенда, Агульнік, завод ланцугоў Галля—Ляўкоў, Гераўкер, завод імя Мяснікова—Закоўскі, паравозное дэпо—Кудзелька, вагоннае дэпо—Картуноў, служба шляху—Ратнек, служба эксплаатацыі—Саак'ян, завод «Большэвік»—Лейзер, Ленцнер, Шараў, абутковая фабрыка імя Кагановіча—Варончанка, Інзбурт, Шпітальнік, друкарня імя Сталіна—Конік, Хейфец, электрастанцыя—Хадасевіч, завод імя Молатава—Готфрыд, Грынкевіч, Розін, ВЭО—Тавакальян, МТМ—Валодька, Азаронак, ЦЭЦ—Рыжыкаў, Джэлюк, Абрамаў, шпалерная фабрыка—Слопім, шчотачная фабрыка—Чыжова, Бэр, шчацінная фабрыка—Свірыдаў, фабрыка «Усход»—Балцін, фабрыка імя Тэльмана—Верба, абутковая фабрыка інд. заказаў—Мінкін, Пам, фабрыка «Окцябр»—Жуковіч, Чарнушэвіч, Васкін, фабрыка «8 сакавіка»—Ашаровіч, Фрышман, фабрыка «КІМ»—Дунец, фабрыка імя Фрунзэ—Шчарбакоў, лямцавая фабрыка—Розенблюм, «Чырвоны тэкстыльшчык»—Суханава, Кузянцова, Белпрамбуд—Горын, Каулін, Менбуд—Гурэвіч (НК Унутран. гандлю), Фрыдман завод стандартных дамоў—Ларан майстэрні Белпрамбуда—Дубіна Трампарк—Амбражунас, пажарна ахова—Глейберман, фабрыка «Комунарка» — Геаргадзе, Матусевіч, хлебазавод—Гвяздзецкі, Хейфец (Заготзярно), мясакамбінат—Кузмін, Оберфельд, завод «Беларусь»—Марусевіч, Кейлін, малочны завод—Кабакоў, завод малочных кіслот—Зуськоў, спіртзавод—Манжалей, «Чырвоная зорка»—Сурта, фабрыка імя Крупскай—Кейлін, Захарава, дрожджазавод «Пролетарый»—Шасткоў, шкловавод—Кудзельскі, Домбаль, хімфармазавод—Олікер, цагельня № 1-3 — Мірангоф, цагельня № 2-4—Клімаў, цагельня № 5-6 — Мельцэр, цагельня № 8—Турбовіч, цагельня № 1—Арабей, Белкамунбуд—Фішбейн, Шадуро.

Арцелі прамысловай і інвалідная кааперацыі: Пінхасік, Гурэвіч (нарсуд), Сандлерскі (нарсуд), Тумін (нарсуд), Клячук (КІЖ), Лурэ, Пяўдоўскі, Ковалёў, Розенгаўз, Аксіцаў, Шпейцер, Шульц, Агурскі, Позняк, Міронаў.

Рэзерв

Меліхаў, Кісялёў, Патапенка, Левіг, Пятровіч (СНК), Каструлёў (БКС), Барзуноў, Любін, Андрыеўскі, Рубінштэйн, Ефімаў, Шустэрман, Офенгейм, Шуковіч-Трацякоў, Давідовіч, Браўковіч, Пінчук, Немец, Галкін, Данілаў, Шыфрын.

По Менскаму раёну

Астрашыцка Гарадзецкі сельсовет: калгас «Новы шлях» — Лубнеўскі (НКЗем), калгас імя Сталіна — Папоў («Калгасник Беларусі»); Папярнянскі сельсовет: калгас «Перамога» — Касцюковіч (РВК); Калодзішчанскі сельсовет: калгас «Ударнік» — тав. Якута (ГК КП(б)Б), калгас «Комсамолец» — тав. Хеўлін (ЦСПСВ), калгас «Большэвік» — тав. Мазур (СНК); Крупіцкі сельсовет: калгас «Новы быт» — тав. Гірко (горпрыкурагура), калгас «1 мая» — т. Варавацкі (вараклуб); Самаглазавіцкі сельсовет: калгас «Ленінскі шлях» — Вадзейка (РВК); Ратамскі сельсовет: калгас «Окцябрская рэволюцыя» — тав. Залескі (гарфа), калгас імя Варашылава — тав. Панамароў (райэа); калгас «Чырвоны партызан», Падгайскі сельсовет — тав. Кавлоў скі (торспажыўсаюз); калгас імя Фалько, Грычанскага сельсовета — тав. Клімаў (ВКСГШБ), калгас імя Дзержынскага, Отрочыцкага сельсовета — Зярніцкі (КІЖ), калгас «Першая конная», Новадворскага сельсовета — Матусаў (Белдзяржкіно), калгас «Усход», Каралішчанскага сельсовета — т. Жарскі (рэдактар «Оркі»), калгас «Комінтэрн», Замастоцкага сельсовета — тав. Зарэмскі (польведтэхнікум), калгас «Адраджэнне», Анчанскага сельсовета — тав. Топаз (НКЮ); калгас імя Карла Маркса, Трасянецкага сельсовета—тав. Адзінцоў (ЦВК), калгас «Чырвоны спецыяліст», Сенніцкага сельсовета — Елянеўскі (НКФін), калгас імя Войкава, Гатаўскага сельсовета — тав. Сыцько (БелАН), калгас імя Будзённага, Кайкаўскага сельсовета — тав. Карнейчык (БелАН), калгас імя Дзержынскага, Прыгараднага сельсовета — Лісневіч (райана), соўгас Русінавічы — Шабалтаў (СНК), соўгас «Анопаль» — Сідакнай (Менмалпромтрэст), соўгас «Самуелева» — Казыроўскі (Малпромтрэст), соўгас «Заціпша» — Тышкевіч (балотны інстытут), соўгас «Сенніца» — Каралёў (птушкатрэст), соўгас «Тарасава» — Самохін (інст. свінагадоўлі), соўгас «Большэвік» — Пашкевіч (свінавадтрэст), соўгас «1 мая» — Матусевіч (свінаводтрэст), соўгас «Курганы» — Мельнікаў (інст. рэк. с.л.), соўгас «Комсамолец» — Белаўсаў.

Увага: Вылучаным таварышам прапануецца з'явіцца сёння-ж, 3-га лістапада, у памяшканне Дома партактыва (малая зала) на інструкцыйны даклад.

Інструкцыйны даклад праведзіць тав. Пассэ.

Сакратар Менгаркома КП(б)Б РЫСКІН.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

Пазыва. БДТ—1 вл. 24905 Белдзяржтэатр Оперы і Балета

Маста кі кіраўнік—засл. артыст рэсп. І. А. ГІТГАРЦ.

Сёння закрыты спектакль для БДУ

КНЯЗЬ ІГАР

Пачатак роўна ў 8 гадзін веч.

Білеты, дзійныя інстытутам Сов. Праве на 3 лістапада, сапраўдны на 17 лістапада.

УСІМ ФАБЗАЎМЯСЦКОМАМ.

Культаддзел ЦСПСВ і дырэкцыя Белдзяржтэатра оперы і балета

паведамляюць, што 6 лістапада

— а д б у д з е ц ц а —

МІЖСАЮЗНЫ СПЕКТАКЛЬ

Білеты на культтаховы у тэатр у пяці яны дзень прымаюцца ў касе тэатра з 12 да 2-х і з 5 да 8 гадз. веч.

КУЛЬТ ДДЗЕЛ ЦСПСВ ДЫРЭКЦЫЯ ТЭАТРА.

Кіно „Спартак"

Ад 3-га лістапада вечар намедзі

Тры праграмы у адзін сеанс

У ПРАГРАМЕ—кіно-хроніка ШТОДЗЕННА 4 СЕАНСЫ.

КАСА—з 4-х гадзін.

ГУКАВЫ кіно-тэатр „Чырвоная Зорка" НОВАЯ ПРАГРАМА Замежны мастацкі фільм гастролі Отто Франкардзі

Гукавы кіно-тэатр „Пролетарый" ЗАКРОЙШЧЫК З ТАРЖКА Канцэрт Усходн. ансамбля

Кіно „Інтэрнацыянал" Совецкі мастацкі фільм ПАЭТ І ЦАР

Мсціслаўскаму педтэхнікуму патрэбны ВЫКЛАДЧЫКІ: матэматыкі, мовы і літаратуры. Нагрузка гарантуецца. Тэхнікум забяспечвае кватэрай і кому вольнымі ўслугамі.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ШУКАЮ 1—2 пакоі ў любым раёне згодзенна рамонт і іншыя выдаткі. За ніць па тэл. №21-360.

УСЕ НА ПРАДОКЦЯБРСКІ КАЛГАСНЫ БАЗАР

да асеняга калгаснага БАЗАРА 4 і 5 лістапада

МЕНГОРСПАЖЫЎСАЮЗ

выступае на калгасных рынках з наступным асартыментам тавараў:

Гатовае адзенне	—20.000 р.	Хустні.	— 5.000 р.
Галаўныя ўборы	— 5.000 р.	Маснацельныя тавары	— 5.000 р.
Галошы	—10.000 р.	Рымарныя.	— 5.000 р.
Абутак	— 5.000 р.	Пасуда	— 5.000 р.
Мануфактура	—10.000 р.	Снабняныя	—10.000 р.
Трыкатаж	—15.000 р.	Мыла гасп.	—10.000 р.
Галантарэя	—10.000 р.	Канд. вырабы	—20 000 р.
Культтавары, шпалеры	— 5.000 р.	Мэбля	—10.000 р.

УСЯГО на суму—150.000 р.

ГАНДАЛЬ БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА:

1. На Чэрвеньскім рынку.
2. На Пл. Парыжскі комуны.
3. На конскім рынку.
4. На Юбілей ай плошчы.

УСЕ НА ПРАДСВЯТОЧНЫ КАЛГАСНЫ БАЗАР

Да калгаснага базара 4 і 5 лістапада

Менскае аддзяленне БЕЛДЗЯРЖСНАБА

арганізуе ў двух ларках на ЧЭРВЕНЬСКІМ РЫНКУ

ПРОДАЖ НАСТУПНЫХ ТАВАРАЎ:

ПАДСОБНЫЯ ТАВАРЫ: шпалеры, збруя, вяроўкі гасп., шапкі зімовыя, рукавіцы, вата, канат пяньковы 3 гатунак, лямец, войлак будаўн., валенкі, культтавары, манцёрскія сумкі на 18.200 руб.

МАСКАЦЕЛЬНЫЯ ТАВАРЫ: вапна, ультрамарын, охра цёртая, мумія, сурык, зашчытная эмаль, сажа цёртая, воск, едкі калій, селітра, кіслата, аліфа, кіт, лак чорны, палітура і інш. на 9.500 р.

ІНСТРУМЕНТЫ: абцугі гаспад., бруски, асёлкі, долаты, рубелкі сталёвыя двух метр., калавароты, камні наждачныя, піскі ручныя і стулавыя, свёрлы па металу, напільнікі, зубілы, калодкі, стамескі, шчоткі для чысткі напільнікаў і па металу і інш. на 13.100 руб.

ГАСПАДАРЧЫЯ ТАВАРЫ: скабяныя тавары, печныя прыборы, ламы жалезныя, восі жалезн., граблі, утулкі калёсн., ложкі жалезн., палковы і жалезна на 28.650 руб.

Усяго на 70 тысяч руб.

Менскаму мясакамбінату патрэбны ВЕТУРАЧ на пастаянную работу, убойшчыкі буйнай і дробнай жывёлы. Мішэвічнікі. Зварачацца: мясакамбінат, да заг. вытворчасці.

Выдавецтву „Звязда" ПАТРЭБНЫ ІСТАПНІКІ І камендант будынку. Зварачацца: Совецкая, 63, 2-г. паверх.

УСЕ НА ПРАДСВЯТОЧНЫ КАЛГАСНЫ БАЗАР

ДА АСЕНЯГА КАЛГАСНАГА БАЗАРА 4 і 5 лістапада

МЕНХАРЧГАНДАЛЬ арганізуе ПРОДАЖ ТАВАРАЎ на наступных рынках у крамах і ларках:

Чэрвеньскі рынак—2 ларкі; плошча Парыжскай Комуны—крама 38, 15 і 2 ларкі; Крыты рынак—2 ларкі, Суражскі рынак—крама № 10; пл. 25 Окцябра—крама № 37 і Конны рынак—ларок.

У ПРОДАЖЫ ВЯЛІКІ АСАРТЫМЕНТ ТАВАРАЎ:

КАНСЕРВЫ—10.000 руб., КАМСА—15.000 руб., ЦУКАР—30.000 руб., ПЯЧЭННЕ—45.000 руб., ЦУКЕРКІ—24.000 руб., ПАПІРОСЫ—12.000 р., ЗАПАЛКІ—1.000 р., МЫЛА ГАСПАДАРЧАЕ—30.000 руб., МАХОРКІ І ТАБАК—12.000 р., ЧАЙ—3.500 р., СОДА ДЛЯ БЯЛІЗНЫ—1.000 руб., БУЛКІ, БАРАНКІ, ЗДОБА—30.000 руб., МАКАРОН—20.000 руб., і інш. РЫС І КРУПА—18.000 р. Усяго на суму—25.000 руб.

ДА ПРАДОКЦЯБРСКАГА КАЛГАСНАГА БАЗАРА

МЕНБАЗА БЕЛПРОМГАНДЛЯ

выступае на калгасны рынак з наступным асартыментам тавараў:

ГАТОВАЕ АДЗЕННЕ,	ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ,
АБУТАК,	РОЗНАЯ ПАСУДА,
ВАЛЕНКІ,	ГАСПАДАРЧЫ ІНВЕНТАР,
ТРЫКАТАЖ,	І інш. на суму 50.000 р.

ГАНДАЛЬ БУДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА:

1) На пляцу Парыжскай Комуны,
2) На Чэрвеньскім тракце,
3) У Крытым рынку.

УСЕ НА ПРАДОКЦЯБРСКІ КАЛГАСНЫ БАЗАР

ДА АСЕНЯГА КАЛГАСНАГА БАЗАРА 4 і 5 лістапада

МЕНСКАЯ МІЖРАЁННАЯ БАЗА БЕЛГАНДЛЯ

выступае з наступным асартыментам тавараў:

ГАТОВАЕ АДЗЕННЕ,	ГАЛАНТАРЭЯ І РОЗН. ГАСП.
АБУТАК,	СКАБЯН. ТАВАРЫ
ГАЛОШЫ,	на суму 150.000 р.
ТРЫКАТАЖ,	
ГАЛАЎНЫЯ ЎБОРЫ,	

Гандаль будзе праводзіцца ў наступных мясцах:

1) Суражскі рынак—ларок № 3,
2) Пляц Парыжскай Комуны—магазін № 6,
3) Пляц 25 Окцябра—ларок № 5,
4) Новы рынак Чэрвеньскі тракт.

ПАСТАНОВА № 17

МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА ад 29-X—34 г.

аб парадку гандлю ў дні свята 17-ай гадавіны Окцябрскай рэволюцыі

1. Прамтаварныя магазіны, харчовыя магазіны спажывецкай сеткі і камерцыйныя, з а к р ы т ы я размеркавальнікі і закрытыя рабочыя размеркавальнікі з 1-га па 6 лістапада працуюць да 12 гадзін ночы без выходных дзён.

2. Хлебныя магазіны на нармаванаму спажыванню і камерцыйнаму гандлю працуюць 7-га лістапада ў звычайным парадку.

3. Кіёскі, ларкі і крамы, гандлюючыя прахладжальнымі напіткамі і півам, працуюць 7-га лістапада з 8-мі гадзін раніцы да 12 гадзін ночы.

4. 7-га лістапада з 4-х гадзін дня да 8 гадз. вечара дежурыць наступныя магазіны:

Менхарчгандаль	№ 29 па Совецкай, 65.
„	№ 52 на Ленінскай, 18.
„	№ 33
МГРК	№ 17 „ Ленінскай, 19.
Менгандаль	№ 8 „ Ленінскай, 9.
БАКТ	№ 1 „ Ленінскай, 20.

5. 8 лістапада ўся гандлёвая сетка горада працуе ў звычайным парадку.

6. З 1 па 6 лістапада гандаль на рынках Менска прадаўжаецца з 8 гадзін раніцы да 8 гадзін вечара.

7-га лістапада рынкі не працуюць.

8-га лістапада рынкі працуюць у звычайным парадку.

7. Адкрытыя сталоўкі, рэстаранны і чайныя працуюць 7 лістапада ў звычайным парадку.

Парадак працы сталовых, буфетаў на прадпрыемствах у дні свята вызначаецца на месцах трыкутнікамі.

8. Пад адказнасць кіраўнікоў усіх гандлюючых арганізацый, прапанаваць убрать памяшканні магазінаў і сталовых, правесці знадворнае афармленне магазінаў і вітрын лозунгамі, плакатамі, дыяграмамі. Тэрмін выканання да 6 лістапада.

9. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладзі на Горунугандаль і РС міліцыю.

Старшыня Менгорсовета ЖУКОВІЧ.

Сакратар Менгорсовета ІПАТАЎ.

УСІМ ФАБЗАЎМЯСЦКОМАМ

Дырэкцыя Белдзяржтэатра оперы і балета арганізуе ў гэтым сезоне (на працягу з 10 лістапада па 1 студзеня 1935 г.)

12 СПЕКТАКЛЕЙ для ЗНАЧКІСТАЎ „ЗОТ" І ЎДАРНІКАЎ

па ўстаноўленаму каляндарнаму плану

цэны білетаў на гэтыя спектаклі паніжаны.

Прадпрыемствы і ўстановы, не паспеўшыя набыць сталыя месцы на ўказаныя 12 спектаклей, могуць падаць заяўкі ў кантору тэатра штодзённа з 12 да 2-х і з 5 да 8 гадз. вечара.

КУЛЬТАДДЗЕЛ ЦСПСВ ДЫРЭКЦЫЯ ТЭАТРА.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы—КРУЧКОЎ, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — М. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр — КАГАН Е., ст. друкар — АНУЧЫН. Уп. Галоўлітбела № К—3283.